

Сталічная грамадскасць усё часцей выступае супраць ушчыльнення забудовы. То тут, то там рэгулярна ўспыхваюць скандалы. Месцам разладу стаў і мікрараён Уручча-2... СТАР. 3



Чаго чакаць ад укаранення «падушавой» сістэмы аплаты працы накшталт той, што ўжо дзейнічае ў Расіі, дзе грошы ў выглядзе ваўчара прывязваюцца да канкрэтнага дзіцяці? СТАР. 4



Што тчэ, забыўшыся, рука? Як зберагчы народныя традыцыі і промыслы, абмеркавалі ў Ганцавічах. СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 ЧЭРВЕНЯ 2012 г. АЎТОРАК № 116 (27231) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПАДПІСАЎ УКАЗЫ, ЯКІЯ ВЫЗНАЧАЮЦЬ ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ВЫБАРАЎ У ПАРЛАМЕНТ

Прэзідэнт Беларусі 18 чэрвеня падпісаў указы, якія вызначаюць тэрміны правядзення выбараў у парламент: у Палату прадстаўнікоў — 23 верасня 2012 года; у Савет Рэспублікі — у перыяд з 30 чэрвеня па 30 верасня 2012 года.

Тэрміны ўстаноўлены з улікам патрабаванняў Канстытуцыі, згодна з якой выбары ў новы склад палат парламента назначаюцца Прэзідэнтам не пазней за чатыры месяцы і праводзяцца не пазней за 30 дзён да заканчэння паўнамоцтваў гэтых палат дзеючага склікання. Тэрмін паўнамоцтваў Палаты прадстаўнікоў дзеючага чацвёртага склікання завяршаецца 27 кастрычніка 2012 года, Савета Рэспублікі — 31 кастрычніка 2012 года.

Фінансаванне расходаў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў будзе ажыццяўляцца ў межах сродкаў, прадугледжаных на гэтыя мэты ў рэспубліканскім бюджэце на 2012 год.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ ТРЭБА ПРАВЕСЦІ СУМЛЕННА, АДКРЫТА, У СТРОГАЙ АДПАВЕДНАСЦІ З ЗАКОНАМ»

**Парламенцкія выбары ў Беларусі пройдуць 23 верасня 2012 года, Савет Рэспублікі будзе сфарміраваны да канца верасня. Аб гэтым паведаміў 18 чэрвеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па пытаннях падрыхтоўкі і правядзення выбараў Нацыянальнага сходу Беларусі пятага склікання.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што парламенцкія выбары — гэта не толькі важнейшая палітычная падзея для краіны, але і адказны экзамен для дзеючай улады, асабліва ўлады мясцовай.

«Хачу адразу папярэдзіць. Ні пад каго звонку мы не павінны падладжвацца і не будзем гэтага рабіць. Выбары праводзяцца для беларускага народа і выключна ў яго інтарэсах. Беларусь — суверэнная дзяржава і не прыме ніякага ўмяшання», — заявіў Прэзідэнт. Пры гэтым ён дадаў, што ў краіне «як працавалі, так і будуць працаваць у звычайным рэжыме, без аўралу і надзвычайшчыны».

«Настройвацца трэба на вырашэнне важнейшай задачы — правесці гэтыя выбары ў строгай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам, сумленна, адкрыта, забяспечыўшы волевыяўленне беларускага народа», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што пры падрыхтоўцы да парламенцкіх выбараў патрэбны згуртаванасць, арганізаванасць і выключная мабільнасць. Ён асабліва звярнуў увагу на тое, што рэалізацыя арганізацыйных мерапрыемстваў павінна праходзіць у спакойнай і канструктыўнай абстаноўцы, пры ўзаемаразуменні з боку ўсіх удзельнікаў выбарчага працэсу. СТАР. 2

# НЕ РАЗБІЦЬ, НЕ СПЫНІЦЬ, НЕ СТРЫМАЦЬ!

## Зборная Беларусі прабілася на чэмпіянат свету па гандболе ўпершыню за 17 гадоў

**Гэты «валідольны» дзень мы набліжалі як маглі. Айчынныя прыхільнікі ручнога мяча здавён шчыра марылі ўбачыць нашых хлопцаў на галоўным форуме планеты. І вось, верылі, спадзяваліся і дачакаліся. Пры відавочным трэнерскім геніі Юрыя Шаўцова і моцнай характарам камандзе. Аднак пачатак драматычнай мінскай сустрэчы не абяцаў беларусам выніковага поспеху...** СТАР. 8



Фота БЕЛТА.

# ВІЗІТКА ЛУНІНЕЦКАГА КРАЮ — КЛУБНІЦЫ



Жыхарка вёскі Дзятлавічы Лунінецкага раёна Алена ЯСКЕВІЧ задаволена сваім сёлетнім ураджаем клубніц, хоць дажджы і не спрыялі хуткаму выспяванню ягад.

— Вельмі важна, што ў час цвіцення клубніц не было замаразкаў, — кажа Алена Дзянісаўна. — Мае аднавяскоўцы таксама задаволены вынікамі агароднай працы.

Калі трэба збіраць ягады, першым на дапамогу бабулі заўсёды прыходзіць унук Уладзіслаў *(на фотаздымку)*.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЛІЧБА ДНЯ

Для грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, за пяць месяцаў уведзена ў эксплуатацыю 985,1 тыс. кв.м агульнай плошчы жылля, або 58,8 працэнта ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. З агульнага аб'ёму ўведзенага жылля для маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі ў студзені-маі бягучага года пабудавана 917,1 тыс.кв.м, або 39,7 працэнта да задання на год. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 430,5 тыс.кв.м агульнай плошчы жылля, або 25,7 працэнта агульнага ўводу па рэспубліцы (у студзені-маі 2011 года — 26 працэнтаў).

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | | |
|---|---|---|
| Брэст | + 27° | дождж |
| Віцебск | + 27° | дождж |
| Гомель | + 29° | сонца |
| Гродна | + 23° | дождж |
| Магілёў | + 27° | сонца |
| Мінск | + 26° | дождж |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.06.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8240,00 | ▼ |
| Еўра | 10460,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 256,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1021,70 | ▼ |

# КЛУБНІЦЫ ПАЙШЛІ!

**Як толькі ўсталявалася добрае надвор'е, распачалася масавая нарыхтоўка клубніц. У Лунінецкім раёне, які традыцыйна корміць салодкімі ягадамі ўсю краіну, зараз вельмі шмат машын: з іншых раёнаў Беларусі, а таксама з Расіі. Такой колькасці аўтатранспарту, што прыбывае па клубніцы, у раёне за апошнія часы не могуць прыгадаць!**

— Ужо закуплена ад насельніцтва 168 тон ягад, — сказала эканаміст Лунінецкага раённага спажывецкага таварыства Аксана Сайко. — Акрамя здачы нам, людзі па-ранейшаму актыўна працягваюць вазіць клубніцы на рынкі самастойна.

На рынках сталіцы апошнімі днямі сапраўды бум салодкай ягады! Густы водар літаральна лунае ў паветры, сустракаючы яшчэ на падыходах да гандлёвых пляцовак. Асартымент і цэны — на любы густ і кішэню. Напрыклад, у мінулыя выхадныя на «Заходнім» рынку клубніцы ішлі ад 16 да 22 тысяч рублёў за кілаграм. Тут жа можна было ўбачыць і кошт у 24-25 тысяч. На рынку ў Ждановічах у той жа час ягаду можна было пабачыць і па 35 тысяч рублёў за кілаграм. Зразумела, людзі імкнуцца знайсці кампраміс паміж коштам і якасцю. Калі таварныя ягады — проста паесці — бяруць кілаграмамі, дык драбнейшыя клубніцы для хатніх нарыхтовак — вёдрамі.

Што да цэн, дык у нарыхтоўшчыкаў літаральна за некалькі дзён яны таксама змяніліся. Крыху падраслі. Паводле слоў эканаміста Лунінецкага раённага спажывецкага таварыства Аксаны Сайко, цяпер клубніцы для вытворчасці віна прымаюць па 2,5 тысячы рублёў за кілаграм, для кансервавых прадпрыемстваў — па 3,5 тысячы рублёў. Таварныя ягады ад насельніцтва ідуць па 10-13 тысяч рублёў за кілаграм.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

■ Дыялог з уладай

# МЯСЦОВАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА «ГАЗАВАЙ ТРУБЕ»

## Свае меркаванні па прыярытэтных пытаннях развіцця вобласці ў інтэрв'ю «Звяздзе» выказаў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА

**КАЛІ б на Гродзеншчыне вызначаўся «рэйтынг» найбольш значных падзей года, то сёлета, безумоўна, гэта быў бы ўвод у эксплуатацыю аб'язной дарогі ў абласным цэнтры. Старажылы горада над Нёманам ведаюць, што гэты праект стаяў на парадку дня яшчэ з пачатку 1970-х гадоў, і многія з іх, пэўна, ужо і не спадзяваліся ўбачыць яго фініш. І раптам... Літаральна за год робіцца амаль удвая больш, чым за папярэдняе дваццацігоддзе. Адсюль і першая тэма ў гутарцы карэспандэнта «Звязды» з кіраўніком вобласці.**



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

### АБ'ЯЗНАЯ ДАРОГА: ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ І ЭКАЛОГІІ

— Пра гэты доўгачаканы праект два гады таму, калі распачынаў працу ў вобласці, мне расказаў дырэктар інстытута «Гроднаграмадзянпраект» (цяпер намеснік старшыні аблвыканкама) Уладзімір Дзяшко. Прычым з павелічэннем узроўню аўтамабілізацыі насельніцтва (Гродна па гэтым паказчыку цяпер у краіне лідар — каля 400 машын на 1000 жыхароў) праблема ўсё больш абвастралася. Аднак, улічваючы аб'ёмы работ, спачатку не надта верылася ў хуткае завяршэнне магістралі, паколькі справіцца толькі сродкамі горада і вобласці было нерэальна. У лютым мінулага года я звярнуўся да Прэзідэнта па пытаннях інжынерна-транспартнай інфраструктуры абласнога цэнтра. Кіраўнік дзяржавы даў даручэнне завяршыць будоўлю аб'язной дарогі за год, з рэспубліканскага бюджэту летась было дадаткова выдзелена 90 мільярдаў рублёў, сёлета — 150 мільярдаў рублёў.

Варта зазначыць, што нарматыўны тэрмін будаўніцтва пуцеправода праз Азёрскую шашу — 3 гады. Аднак пры падтрымцы Прэзідэнта, урада мы пабудавалі яго за 8 месяцаў, ні ў чым не парушыўшы тэхналогію. На аб'язной дарозе былі сканцэнтраваны будаўнікі з усёй вобласці, пастаўшчыкі матэрыялаў, і пры бездакорным фінансаванні на будоўлі ніводнага дня не прастойвалі без працы. Прынцып быў такі: чым хутчэй будуеш — тым гэта танней у сувязі з ростам цэн у будаўніцтве.

Дзякуючы аб'язной дарозе, сур'ёзных транспартных праблем, затораў у цэнтральнай частцы горада амаль не засталося, былі «злучаны» вытворчыя зоны, жыллёвыя мікрараёны. Будзе эканоміцца шмат аўтамабільнага паліва, стане менш шкодных выкідаў у атмасферу.

Цяпер задача ў горадзе над Нёманам, які з'яўляецца «візітоўкай» нашай краіны на яе заходняй мяжы, — добраўпарадкаванне вуліц і дваровых тэрыторый. Прычым у шэрагу месцаў спачатку патрабуецца замена састарэлых камунікацый, і ўжо пасля — асфальтаванне. Дарэчы, добры прыклад у гэтым кірунку паказвае Слонім, дзе мэтанакіравана, без аўралаў робяць горад усё больш дагледжаным.

### СУЧАСНЫЯ ФЕРМЫ: ПА АДНЫМ ПРАЕКЦЕ

— Сёння ў вобласці больш за палову пагалоўя кароў дояць на сучасных фермах, дзе не толькі забяспечана нармальнае ўтрыманне жывёлы, але і, у першую чаргу, створаны належныя ўмовы для працы людзей. Некаторыя раёны ўжо практычна стапрацэнтна забяспечаны такімі фермамі, у бліжэйшыя два гады пабудуем яшчэ 59. Яшчэ пры ранейшым кіраўніцтве аблвыканкама быў выбраны вельмі добры праект, якім забяспечваецца самае таннае жывёла-месца на такіх фермах у краіне. Пры гэтым важна, што адзіны праект вельмі зручны і для нашых заводаў, якія вырабляюць жалезабетон, і для будаўнікоў, якім не трэба вучыцца, пераходзячы да наступнай фермы. Прычым, некаторыя з іх не проста будуюць, але і самі вырабляюць камплектныя часткі. Такім чынам гэта работа выходзіць на сур'ёзны канвеер. СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У НІГЕРЫІ ТЭРАРЫСТЫ АТАКАВАЛІ ЦЭРКВЫ: 45 ЧАЛАВЕК ЗАГІНУЛІ



Колькасць загінулых у выніку некалькіх тэрактаў, якія адбыліся на поўначы Нігерыі, і беспарадкаў, якія пракаціліся следам за гэтым, паводле апошніх звестак, павялічылася да 45 чалавек, больш за 130 атрымалі раненні, паведамляюць інфармагенцтвы. За дзень у Нігерыі адбылося 5 нападаў на цэрквы. Тэракты былі здзейснены раніцай на працягу адной гадзіны. У Зарыа дзейнічалі тэрарысты-смяротнікі на начыненых дынамітам аўтамабілях. Яны ўехалі ў цэрквы, перапоўненыя з нагоды нядзельнага набажэнства. Яшчэ ў двух выпадках злачынцы ўрываліся ў храмы і расстрэльвалі вернікаў з аўтаматаў. Адзначаецца таксама, што пасля тэрактаў у горадзе Кадуна пачаліся беспарадкі. Маладыя людзі (як мяркуецца, паслядоўнікі хрысціянскіх рэлігійных плыняў) заблакавалі дарогу, якая вядзе з горада ў паўднёвым кірунку, і пачалі нападаць на мусульман. У сувязі з гэтым улады штата ўвялі каменданцкую гадзіну.

### ФРАНЦЫЯ: САЦЫЯЛІСТЫ АТРЫМАЛІ АБСАЛЮТНУЮ БОЛЬШАСЦЬ

Абсалютную большасць галасоў у другім туры парламенцкіх выбараў атрымала Сацыялістычная партыя і яе саюзнікі. Кандыдаты, якія прадстаўляюць левыя палітычныя партыі, будуць шырока прадстаўлены ў Нацыянальным сходзе. Ім удалося атрымаць 314 з 577 дэпутацкіх месцаў, што на 25 мандатаў перавышае абсалютную большасць. Партыя цяперашняга прэзідэнта краіны Франсуа Аланда заваявала 180 крэслаў, крайнія левыя сілы — 12, «Еўропа — Экалогія — Зялёныя» — 17, тады як Левы фронт — 10. Левыя сілы падтрымаў амаль 51% выбаршчыкаў. Партыя былога кіраўніка Францыі Нікаля Саркazi — правы Саюз у падтрымку народнага руху — атрымаў 194 крэслы. На выбарах была зафіксавана вельмі нізкая яўка (56,29%).

### ДЫЕТОЛАГІ СКЛАЛІ САМАЕ ЗДАРОВАЕ МЕНЮ

У ходзе нядаўняга даследавання Leatherhead Food Research навукоўцы вырашылі скласці ідэальнае меню, піша The Daily Mail. У спіс адабраных страў уваходзяць свежы і вэнджаны ласось (багаты на кіслату амега-3 і даказагексаенавую кіслату, карысную для сасудаў, сэрца і мозгу). Запяканка з курыцай, сачавіцай і гароднінай — ідэальны выбар у якасці асноўнай стравы. Пратэін, які змяшчаецца ў гэтай страве, дае магчымасць нарасціць мышачную масу, а пантатэнавая кіслата з сачавіцы памяншае стомленасць і спрыяе разумовай дзейнасці. На дэсерт даследчыкі прапануюць ёгуртавы пудынг з грэцкімі арэхамі і карамельнай падліўкай.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ВЫБАРЫ Ў ГРЭЦЫІ: ЕЎРОПА ЎЗДЫХНУЛА З ПАЛЁГКАЙ



Кансерватыўная партыя «Новая дэмакратыя» па выніках апрацоўкі 66 працэнтаў бюлетэняў набірае 30,1 працэнта галасоў і атрымлівае 130 месцаў у парламенце з 300. Большасць «Новай дэмакратыі» забяспечвае правіла, згодна з якім партыя, што набрала большасць галасоў, атрымлівае дадатковыя 50 мандатаў. Левaрадыкальная кааліцыя «Сірыза» набірае 26,5 працэнта і можа разлічваць на 70 месцаў, а сацыялісты з ПАСОК — 12,6 працэнта і 34 месцы. «Новая дэмакратыя» і «Сірыза» радыкальна разыходзяцца па пытанні фінансавай дапамогі і супрацоўніцтва з Еўрасаюзам. Кансерватары выступаюць за прыняцце фінансавай дапамогі ў памеры 240 млрд еўра і за захаванне Грэцыі ў складзе ЕС. Левaрадыкалы заклікаюць адмовіцца ад пагадненняў аб фінансавай дапамозе і адмяніць уведзеныя за апошнія два гады захады эканоміі сродкаў.

КОРАТКА

Прадпрыемствы Беларусі прадставяць сваю прадукцыю на другой выстаўцы-кірмашы «Беларуская якасць» у Маскве з 21 па 24 чэрвеня, паведамілі ў Мінскім аддзяленні БелГПП. Беларусь прадэманструе шырокі асартымент прадукцыі харчовай галіны, а таксама тавараў народнага спажывання.

Чысты прыбытак сельгасарганізацый Беларусі ў студзені—красавіку 2012 года павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года ў тры разы і склаў Br2 трлн 849,7 млрд, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Ад рэалізацыі прадукцыі выручана Br16 трлн 125,4 млрд, што ў 2,7 раза больш.

Першая пара сусветнага рэйтынгу беларус Максім Мірны і канадзец Даніэль Нестар сталі пераможцамі тэніснага турніру ў Лондане (прызавы фонд 625 тыс. еўра). Усяго за прафесійную кар'еру, якая пачалася ў 1996 годзе, самы вядомы беларускі тэнісіст 45 разоў станавіўся чэмпіёнам парных турніраў пад эгідай АТП з рознымі партнёрамі.

# ЧЫМ ВАС ПРЫВАБЛІВАЕ БЕЛАРУСКАЯ ГЛЫБІНКА?



**Сяргей КРАСНОЎ, супрацоўнік комплекснай брыгады студгарадка БДУ:**

— Глыбінка — гэта, у першую чаргу, цішыня для душы чалавечай. У горадзе заўсёды некуды спяшаюцца, бягуць — як у мурашніку. А глыбінка — гэта лепшае, што ёсць у Беларусі, таму што ўсе гэтыя мегаполісы моцна псуюць людзей — і здароўе, і нервовую сістэму. Можа, у маладым узросце ўсе мы хочам трапіць у горад, пабачыць рэстараны, кавярні, кіно, тэатры, а калі становішся больш сталым, хочацца проста адпачыць. А што можна рабіць у горадзе, нават сямейнаму чалавеку? Лядоўня, тэлебачанне, кухня. А ў глыбінцы заўсёды знойдзецца нейкая праца, асабліва для душы. Я ўжо не кажу пра паляванне, рыбалку.

Зараз я жыву ў вёсцы за 25 кіламетраў ад Мінска і, прызнацца, дабірацца на працу мне бліжэй, чым са спальных раёнаў сталіцы.



**Надзея СУСЛАВА, аглядальнік газеты «Туризм и отдых»:**

— Беларуская глыбінка — гэта, па-першае, процьма пэўных аўтэнтычных рэчаў, напрыклад, абрадаў — нематэрыяльнай культуры. Таму што з матэрыяльнай шмат што не захавалася, многія дамы перабудоўваліся — сапраўдную аўтэнтыку складана знайсці. А вось абрадаў у Беларусі налічваецца каля васьмідзесяці. Яны абсалютна арыгінальныя, фальклорныя, непаўторныя — такіх няма нідзе ў свеце. Першы крок ужо зроблены: «Калядныя цары», якія праводзяцца ў Семежава, уключаны ў спіс культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Але ёсць і не менш арыгінальныя абрады — на Лепельшчыне «Жаніцьба Цярэшкі», «Вясельны каравай» у Моталі на Іванаўшчыне, ёсць «Юр'е», «Ваджэнне стралы» — шмат цікавых з'яў, якія толкам ніхто не ведае і не вывучае. Самае галоўнае, што яны недаступныя людзям, якія прыязджаюць з-за мяжы, турыстам — ім гэтага ніхто не паказвае. А нашы абрады не горшыя, чым якія-небудзь скокі ў індзейцаў, папуаскія расфарбоўкі.

Па-другое, беларуская глыбінка — гэта людзі: гасцінныя, добрасардэчныя, мілыя, якія хочуць паказаць усё самае лепшае.



**Андрэй ІВІНСКІ, кіроўца:**

— Я нарадзіўся ў Хойніках — гэта была сапраўдная глыбінка! Прырода, экалогія — вось што мяне вабіла. Я кіроўца і шмат паездзіў па маленькіх вёсачках, пабачыў беларускую глыбінку. І калі параўноўваць яе, напрыклад, са смаленскай, то наша нашмат лепшая, больш дагледжаная.

Аднак зараз народ моцна абляніўся, нават у сваёй гаспадарцы, ля свайго прыватнага дома плот не можа паставіць. З-за чаго гэта? Вось пытанне... Каб людзі былі больш старannымі і давялі б да ладу свае падворкі, стала б даволі прыгожа.

Некалі я трымаў дзесяць свіней і дзве каровы, каб зарабіць грошай. Аднак цяпер няма такой магчымасці: усё скупляюць у насельніцтва вельмі танна. І з-за гэтага часта ідзем па лесвіцы — трава някошаная, бур'ян — усё не тое, не акультуранае.

Я лічу, што любую глыбінку можна зрабіць «разыначкай», калі ёсць такое жаданне.

**Падрыхтавала Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

## «ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ ТРЭБА ПРАВЕСЦІ СУМЛЕННА, АДКРЫТА, У СТРОГАЙ АДПАВЕДНАСЦІ З ЗАКОНАМ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўнік дзяржавы лічыць гэта вельмі важным у цяперашняй выбарчай кампаніі. «Мы навучыліся праводзіць выбары, як свята для беларускага народа. Давайце яшчэ раз зробім гэта свята. Гэты дзень павінен быць святам для людзей», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

На думку Прэзідэнта, неабходна адказна падысці і да фарміравання выбарчых камісій. «Прыняцце рашэнняў аб іх утварэнні трэба ажыццяўляць, як таго патрабуе закон, адкрыта, з удзелам палітычных партый і грамадскіх арганізацый. Прадстаўнікоў партый, незалежна ад іх палітычных поглядаў, якія дастойна зарэкамендавалі сябе пры правядзенні ранейшых выбарчых кампаній, трэба ўключаць у склад выбаркамаў. Тыя ж, хто раней садзейнічаў дэзарганізацыі выбараў, не павінны атрымаць другога такога шанцу», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў аб тым, што пры рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты не павінна быць ніякіх надуманых абмежаванняў. «Усіх, хто мае права быць зарэгістраваным, трэба рэгістраваць. Кожнаму грамадзяніну краіны павінны быць прадастаўлены ўсебаковыя магчымасці для рэалізацыі права выбіраць і быць выбраным», — сказаў Прэзідэнт. «Мясцовыя органы ўлады павінны прадаставіць гарантыі вядзення перадвыбарных грамадскіх мерапрыемстваў на ўмовах не горшых, чым гэта было пры правядзенні выбараў Прэзідэнта краіны ў 2010 годзе», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на тым, што незаконныя дзеянні, палітычныя правакацыі, накіраваныя на дэстабілізацыю абстаноўкі ў краіне, павінны адразу ж спыняцца, а вінаватыя — несці ўстаноўленую адказнасць. «Павага да закону абавязковая для ўсіх! Без гэтага не можа быць ніякага дэпутата парламента», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Відавочна, што ўвядзенне перадвыбарнай агітацыі не можа ажыццяўляцца па правілах масавых вулічных акцый. Задача праваахоўных органаў — не дапусціць перарастання перадвыбарных сустрэч у такія мерапрыемствы. Правапарадак павінен быць забяспечаны паўсюдна!» — адзначыў Прэзідэнт.

Ён асабліва спыніўся на пытаннях работы на маючых адбыцца выбарах назіральнікаў.

На думку кіраўніка дзяржавы, самую актыўную ролю тут трэба адвесці назіральнікам у першую чаргу ад канструктыўных палітычных партый, прафсаюзаў, моладзевых і ветэранскіх арганізацый, працоўных калектываў. «Гэта дасць магчымасць узмацніць грамадзянскі кантроль за ходам парламенцкіх выбараў, зрабіць іх больш празрыстымі», — лічыць Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу забяспечыць максімальнае садзейнічанне рабоце міжнародных назіральнікаў на маючых адбыцца парламенцкіх выбарах у Беларусі і стварыць спрыяльную атмасферу для іх дзейнасці.

«Пры гэтым хачу заўважыць: ніякіх міжнародных назіральнікаў, як гэта было раней, цягнуць у краіну воламі мы не будзем. У той жа час жадаючым паглядзець, як праходзяць выбары ў Беларусі, мы павінны такое права прадаставіць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што асноўная нагрузка пры падрыхтоўцы выбараў ляжыць на Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў.

Кіраўніку дзяржавы аб ходзе выканання пастаўленых задач, а таксама аб арганізацыйна-прававых аспектах выбарчай кампаніі далажыла старшыня камісіі Лідзія Ярмошына.

Яна адзначыла, на мясцовыя ўлады ўскладзены вялікія функцыі па аказанні садзейнічання рабоце выбарчых камісій. «Менавіта ад гэтай работы, ад узаемадзеяння залежыць атмасфера выбараў, якая і вызначае, як адносяцца да іх выбаршчыкі. Выбаршчыкі адносяцца да выбараў добра, калі лічаць іх справядлівымі, — падкрэсліла кіраўнік ЦВК. — І таму трэба зрабіць максімум для таго, каб выбаршчык быў упэўнены, што ўсе ўдзельнічаюць у выбарах на роўных умовах і нікому не робіцца нейкія асаблівыя прэферэнцыі».

Лідзія Ярмошына звярнула ўвагу на тое, што да 9 ліпеня адбудзецца першы этап выбарчай кампаніі — утварэнне акруговых выбарчых камісій. Таму важна забяспечыць своечасовае інфармаванне жадаючых прыняць удзел у рабоце выбаркамаў. Гэты працэс павінен праходзіць адкрыта і галосна, як таго патрабуе закон.

Было адзначана, што ў 2010 годзе ў выбарчым заканадаўстве з'явілася новая форма збору подпісаў у выглядзе пікетаў, якая зарэкамендавала сябе як добрая дэмакратычная практыка ў час прэзідэнцкіх выбараў. Лідзія Ярмошына заўважыла, што месцы, дзе забаронена правядзенне такіх пікетаў, павінны канкрэтна ўказвацца, каб не ствараць умоў для магчымасці вольнага тлумачэння заканадаўчых норм.

Кіраўнік ЦВК падкрэсліла важнасць стварэння роўных умоў для кандыдатаў у дэпутаты, максімальна лаяльнага ў рамках закону падыходу пры іх рэгістрацыі, забеспячэння поўнай інфармаванасці выбаршчыкаў, недапушчальнасць стварэння штучных бар'ераў і абмежаванняў.

У ходзе нарады былі прадметна абмеркаваны ўсе асноўныя аспекты арганізацыі і правядзення маючай адбыцца выбарчай кампаніі. Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз акцэнтаваў увагу ўдзельнікаў нарады на задачы строгага выканання норм беларускага заканадаўства.

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь другога склікання ЖУЛЬПО Станіслава Віктаравіча і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне Старшыні Вярхоўнага Савета БССР 12-га склікання Дзямянцею Мікалаю Іванавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — заўчаснай смерцю сына Валерыя.**

**Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні Старшыні Вярхоўнага Савета БССР 12-га склікання Дзямянцею Мікалаю Іванавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — заўчаснай смерцю сына Валерыя.**

## АБЗАЦ

◢ За мінулы тыдзень у вадаёмах Беларусі патанулі 13 чалавек. Большасць няшчасных выпадкаў на вадзе адбылося падчас рыбнай лоўлі. Напрыклад, у рыбака з Наваполацка перакулілася лодка, з-за чаго ён апынуўся ў вадзе. У Гомельскай вобласці мужчына заблытаўся ў ім жа расстаўленых сетках, а ў Магілёўскай вобласці патануў чалавек, які лавіў рыбу з берага. Ён быў апрануты ў касцюм хімабароны і паслізнуўся.

◢ **Мікрааўтобус і цягнік сутыкнуліся на пераездзе ў Мінскім раёне на перагоне Ратамка—Крыжоўка. 20-гадовы кіроўца на «Фальксваген Мультывэне» выехаў на забараняльны сігнал святлафора. Пераезд быў абсталяваны сігналізацыяй, якая дзейнічала. У выніку пацярпела 20-гадовая пасажырка аўтамабіля, яна была дастаўлена ў бальніцу з ударам галаўнога мозга і пераломам носа. Затрымка руху цягнікоў склала 75 хвілін.**

◢ У Мінску ў веласіпедыста спынілася сэрца прама на праезнай частцы дарогі. Кіроўца на вул. Гурскага ўбачыў чалавека, які ляжаў на дарозе. Ён выклікаў хуткую і міліцыю. Падчас папярэдняга агляду высветлілася, што на целе пацярпелага няма прыкмет гвалтоўнай смерці або якіх-небудзь траўмаў. Вядзецца праверка.

◢ **Увечары 17 чэрвеня жанчына на прыпынку грамадскага транспарту ў в. Раздзялавічы Ганцавіцкага раёна раскрыла парасон, каб схавацца ад дажджу. Аднак у яго трапіў разрад маланкі. Жанчына з апёкамі 50% цела трапіла ў бальніцу.**

## ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ У Кнігу рэкордаў Расіі занесена дасягненне па ўмяшчальнасці салона аўтамабіля. Для гэтага група маладых дзяўчат у колькасці 31 адзінкі ўсімі магчымымі спосабамі ўтрамбавалася ў «Масквіч» 1980 года выпуску. Першай дзяўчыне, якая адправілася ў салон, уручылі распакаваны торт. У выніку 27 дзяўчат умудрыліся ўціснуцца ў салон, а яшчэ 4 — у багажнік. Праз 5 секунд рэкорд быў паспяхова зафіксаваны.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

# МЯСЦОВАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА «ГАЗАВАЙ ТРУБЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Разам з тым, 104 фермы па даручэнні Прэзідэнта аднаўляюцца сіламі гаспадарак гаспадарчым спосабам. Мяркую, што за тры-чатыры гады ўся жывёлагадоўля нашай вобласці будзе мець самыя сучасныя ўмовы.

### МЕЛІЯРАЦЫЯ: ДА ЗЯМЛІ — ПА-ГАСПАДАРСКУ

— У нашай вобласці ўдвая менш меліяраваных земляў, чым, напрыклад, у Гомельскай і Брэсцкай. Калі мы прааналізавалі сітуацыю, то высветлілася, што з-за адсутнасці фінансавання на меліярацыю шмат тэхнікі гэтых структур працавала ў будаўнічых арганізацыях. Пры гэтым у многіх раёнах вельмі ўрадлівая зямля не давала аддачы для эканомікі, зарастаючы хмызняком і дрэўцамі. Мяркую, што гэта не па-гаспадарску — не выкарыстоўваць такую зямлю, асабліва з улікам задач па продажы прадуктаў харчавання на знешнія рынкі. Таму мы павінны за бліжэйшыя гады ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу меліярацыйных прадпрыемстваў і выканаць работу па ўключэнні высокаўрадлівых земляў у гаспадарчы абарот. Меліяратары працуюць вельмі актыўна: 2010 год — 3 тысячы гектараў, летась — 15 тысяч, а сёлета — 25 тысяч гектараў. Прычым гектар меліяраванай зямлі ў вобласці самы танны ў краіне, бо ў нашых умовах гэта можна зрабіць з параўнальна невялікімі затратамі.

Сёння Гродзеншчына выпрацоўвае паўтара мільёна тон збожжа. Лічу, што з навядзеннем парадку на зямлі, уводам дадатковых плошчаў і павышэннем ураджайнасці мы можам рэальна выйсці на 2— 2,5 мільёна тон.

### ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ: СУМЛЕННА, ЗА РЭАЛЬНЫ КОШТ

— Я эканаміст, адным з першых у краіне паспрабаваў стварыць шэсць таварыстваў з абмежаванай адказнасцю на базе аднаго сельгаспрадпрыемства, разлічваючы на развіццё прыватнай ініцыятывы. Але потым убачыў, што людзі, якія, у маім разуменні, павінны стаць уласнікамі, па-ранейшаму кралі салярку і запчасткі нават са сваіх трактароў. І калі мяне запрасілі працаваць у Міністэрства сельскай гаспадаркі, то на пытанне, колькі часу неабходна для ўкаранення «прыватных» падыходаў па ўсёй краіне, я адказаў: 40 гадоў. Як і паводле Біблії: для таго, каб зрабіць з рабоў свабодных людзей. Калі чалавек прызвычаіўся нядобрасумленна ставіцца да працы, то перавыхаваць яго вельмі цяжка. Гэта працяглы, эвалюцыйны працэс, і ў першую чаргу — светапоглядны. Павінна быць іншае стаўленне да людзей, справы.

Так, менавіта на аснове прадпрымальніцтва ўзмацнялася эканоміка практычна ўсіх развітых дзяржаў. І мы да гэтага прыйдзем. Ужо сёння вобласць атрымлівае 20 працэнтаў падаткаў ад

> **І калі мяне запрасілі працаваць у Міністэрства сельскай гаспадаркі, то на пытанне, колькі часу неабходна для ўкаранення «прыватных» падыходаў па ўсёй краіне, я адказаў: 40 гадоў. Як і паводле Біблії: для таго, каб зрабіць з рабоў свабодных людзей.**

бізнэс-супольніцтва, і я перакананы, што ў далейшым будзе значна больш. Але пры гэтым першапачатковае накапленне капіталу павінна быць сумленным.

Сістэма, па якой сёння ў нас магчымая прыватызацыя, дазваляе за мізэрныя грошы купіць магутнае прадпрыемства з вялізным прыбыткам і за кароткі тэрмін павялічыць свае даходы ў дзясяткі разоў. Хоць ва ўсім свеце ёсць падыходы, як рабіць прыватызацыю, адпаведныя методыкі. Там прадаюцца не акцыі па нейкіх балансавых ацэнках, а прадаецца бізнэс — у залежнасці ад структуры, сістэмы, па якой працуе прадпрыемства. Калі яно, умоўна, зарабляе ў год 2 мільёны долараў, то бярэцца разлік, дапусцім, на падставе пяці гадоў — значыць, прадпрыемства каштуе 10 мільёнаў. У нас жа атрымліваецца так, што кантрольны пакет акцый «Беллакта» можна было (што і зроблена аблвыканкамам) выкупіць усяго за 15 мільярдаў рублёў. А колькі трэба грошай, каб пабудаваць аналагічнае прадпрыемства? Не 15, а прыблізна 600—700 мільярдаў!

Альбо такі прыклад. Да мяне звярнуліся з аднаго будаўнічага прадпрыемства, якое сталі выстаўляць на продаж. Летась там набылі дадаткова тры экскаватары. Дык вось, гэтае прадпрыемства ацанілі... прыкладна ў цану нават не трох, а двух экскаватараў. Купіў прадпрыемства, потым, дапусцім, прадаў гэтыя два экскаватары і вярнуў свае грошы. І ў цябе па сутнасці бясплатна застаюцца дзясяткі адзінак тэхнікі, вялікая тэрыторыя, памяшканні. Гэта несумленны шлях, я супраць такой прыватызацыі.

### ХОЛДЫНГІ: ТОЛЬКІ БЕЗ КАМПАНЕЙШЧЫНЫ

— Холдынгі — «штука» зусім не новая, а вядомая яшчэ з XIX стагоддзя па работах вядомых вучоных-эканамістаў Чаянава і Кандрацьева. Гэта кааперацыя прадпрыемстваў у мэтах узаемнай выгады па пытаннях забеспячэння рэсурсамі, арганізацыі вытворчасці і збыту прадукцыі. Формы былі розныя — пулы, канцэрны, сіндыкаты, трэсты... Але кардынальным прынцыпам кааперацыі заўсёды было добраахвотнае жаданне ўдзельнікаў холдынга. У нас жа, такое ўражанне, адбываецца кампанейшчына. Яшчэ не ўбачылі эфектыўнасць першых холдынгаў — ствараем другія, трэція, прычым гэта робіцца зверху, часта без выслухоўвання меркаванняў працоўных калектываў і іх кіраўнікоў.

Як фарміруем холдынгі? Напрыклад, «МАЗ» забраў даволі паспяховае прадпрыемства — Гродзенскі механічны завод, які вырабляе, у прыватнасці, цыстэрны для малака, паліва. А вось завод у Лідзе па выпуску аўтобусаў ужо не цікавіць, бо ён цяпер у горшым эканамічным становішчы. Выбіраем «з булкі разынкі», каб потым паказаць, што мы аб'ядналіся, і выраслі аб'ёмы вытворчасці? А тых прадпрыемстваў, якія знаходзяцца ў цяжкім становішчы і маюць патрэбу ў дапамозе, холдынгі не датычацца?

На мой погляд, у падобным выкананні ў ідэі холдынгаў для нашай эканомікі перспектывы не будзе.

### МЯСЦОВАЕ ПАЛІВА: АЦЯПЛЕННЕ БУДЗЕ ТАННЕЙШЫМ

— «Газавая труба» нас распесціла, мы недаацэньваем мясцовыя віды паліва. Хоць сёння ёсць эфектыўныя тэхналогіі па атрыманні цяпла і гарачай вады з выкарыстаннем біямасы. Ужо цяпер у паліўным балансе жыллёва-камунальнай гаспадаркі вобласці 25 працэнтаў займаюць драўняныя трэскі і торф. Да канца сёлетняга года выйдзем на 40, а ў наступным — больш чым на 50 працэнтаў. Лічу, што за тры-чатыры гады ўсе катлы ЖКГ павінны працаваць на трэсках, тым больш што яны вырабляюцца ў Беларусі. А катлы той магутнасці, якія ў нас пакуль не выпускаюцца, для буйных гарадоў, пэўна, трэба купіць за мяжой. Як гэта зроблена, напрыклад, у Пружанах, дзе такім чынам ацяпляецца практычна ўвесь райцэнтр — з атрыманнем і цеплавой, і электрычнай энергіі. У такіх кацельнях можна выкарыстоўваць і газ, і трэскі.

> **Кардынальным прынцыпам кааперацыі заўсёды было добраахвотнае жаданне ўдзельнікаў холдынга. У нас жа, такое ўражанне, адбываецца кампанейшчына. Яшчэ не ўбачылі эфектыўнасць першых холдынгаў — ствараем другія, трэція, прычым гэта робіцца зверху, часта без выслухоўвання меркаванняў працоўных калектываў і іх кіраўнікоў.**

Само жыццё, ды і вопыт іншых краін падказваюць, што гэтым трэба вельмі актыўна займацца. Тым больш што біямасы ў нас хапае і ўжо сёння гігакалорыя цяпла з мясцовых рэсурсаў самая танная ў параўнанні з іншымі (пры выкарыстанні газу і трэсак — адпаведна 498 і 370 рублёў). Калі ж працэс задзейнічання трэсак удасканалім, то будзе яшчэ танней. Пры гэтым спатрэбіцца менш валюты на закупку газу, створым рабочыя месцы для нашых людзей, атрымаем падаткі.

### БЮДЖЭТНЫЯ ГРОШЫ: У РАМКАХ КАЛЕГІЯЛЬНЫХ РАШЭННЯЎ

— Калі я пачынаў працаваць старшынёй аблвыканкама, то спачатку былі просьбы даць грошай на тое ці іншае, звярталіся і праз маіх сяброў, знаёмых. І калі б я хоць аднаму такім чынам пасадзейнічаў, то потым у прыёмнай увесь час былі б чэргі з хадакоў «па грошы». Аднак гэты шлях бесперспектыўны, бо грошы трэба не атрымліваць праз знаёмствы, а зарабляць — на палях, фермах, прамысловых прадпрыемствах. Таму бюджэтныя сродкі ў вобласці размяркоўваюцца з удзелам усіх кіраўнікоў рэгіёнаў — яны тлумачаць, даказваюць, на што патрабуецца фінансаванне, і мы калегіяльна прымаем рашэнне. А я потым кантралюю, як у рамках гэтых рашэнняў выдаткоўваюцца грошы.

### ПРЫЯРЫТЭТНЫЯ АБ'ЕКТЫ: НЕ ТОЛЬКІ КАНТРОЛЬ

— Сёлета ў вобласці ажыццяўляецца маштабная праграма будаўніцтва і рэканструкцыі аб'ектаў сацыяльнай сферы — аховы здароўя, адукацыі, культуры, спорту. На гэтыя мэты з бюджэту выдаткавана 110 мільярдаў рублёў, і я амаль штодзённа бываю на будаўнічых аб'ектах. Не толькі дзеля кантролю: на душы прыемна, калі бачыш, як нешта важнае паляпшаецца, пашыраецца. І другое: сёння самая галоўная задача — не будаваць так, як раней, спадзеючыся толькі на будаўнічую арганізацыю (доўга можна чакаць, пакуль яна прыйдзе і зробіць), а праяўляць ініцыятыву. І сёння многія кіраўнікі актыўна задзейнічаюць гаспадарчы спосаб. Бюджэт дае сродкі на будматэрыялы, зарплату, а яны бяруць на працу работнікаў па дагаворы падраду. Такая задача пастаўлена, у прыватнасці, галоўным урачам раённых бальніц, актыўна працуюць гаспадарчым спосабам каля 300 устаноў адукацыі. Учора я глядзеў, як у адной установе культуры даволі хутка і за прымальныя грошы ажыццявілі капітальны рамонт вялізнага памяшкання з поўнай аддзелкай.

Зразумела, што на складаных аб'ектах, дзе немагчыма скарыстацца гаспадарчым спосабам, працуюць падрадныя арганізацыі. Сёлета завершана рэканструкцыя абласнога перынатальнага цэнтра з закупкай новага тэхналагічнага абсталявання. Працягваецца рэканструкцыя карпусоў абласной інфекцыйнай бальніцы, пачынаюцца рамонтныя работы ў абласным клінічным цэнтры «Фтызіятрыя». Сярод аб'ектаў сёлетняй інвестыцыйнай праграмы таксама абласная станцыя пералівання крыві, псіханеўралагічная бальніца «Астроўля», інтэрнат Гродзенскага медыцынскага каледжа, лячэбны корпус Ваўкавыскай цэнтральнай раённай бальніцы і іншыя ўстановы аховы здароўя. А ў наступным годзе разлічваем ажыццявіць рэканструкцыю будынкаў былой чыгуначнай бальніцы пад стацыянар і паліклініку абласнога скурна-венералагічнага дыспансэра, а таксама пабудаваць дзіцячы корпус абласной інфекцыйнай бальніцы.

А што датычыцца спартыўных аб'ектаў, то ў нашых планах на наступны год буйны праект — будаўніцтва ў Гродне залы гульнявых відаў спорту для стварэння добрай трэніровачнай базы і правядзення спаборніцтваў на высокім узроўні.

### АСАБІСТЫЯ ЗАХАПЛЕННІ: УЖО НЕ ПАЛЯВАННЕ, А СПОРТ

— Раней маім хобі было паляванне, аднак цяпер захапленне, звязанае са зброяй, для мяне, можа, не зусім прыгожае. Таму асноўнае хобі — спорт. Летась нават сам займаўся, але сёлета, на жаль, «заваліў» справу (спадзяюся, часова). А як балельшчык, з задавальненнем хаджу на хакей, а таксама на баскетбол, валейбол. Перажываю, што пакуль не ўдаецца стварыць у Гродне добрую футбольную каманду. Пэўны патэнцыял у яе ёсць, але каманда яшчэ не сфарміравана, духу каманднага, на мой погляд, ёй не хапае.

> **Грошы трэба не атрымліваць праз знаёмствы, а зарабляць — на палях, фермах, прамысловых прадпрыемствах. Таму бюджэтныя сродкі ў вобласці размяркоўваюцца з удзелам усіх кіраўнікоў рэгіёнаў — яны тлумачаць, даказваюць, на што патрабуецца фінансаванне, і мы калегіяльна прымаем рашэнне.**

Часу, каб адпачыць разам з сям'ёй, практычна няма. Зрэшты, чым менш бачышся з жонкай, тым лепей сямейныя адносіны (*усміхаецца.* — **Б.П.**). Увогуле я яшчэ ніводнага разу не быў у санаторыі. Калі бяру водпуск, то, як правіла, еду ў вёску, дзе ў маладосці пачынаў старшынёй калгаса, сустракаюся з землякамі. Аднак праз некалькі дзён ужо хочацца на працу. Дарэчы, самай цікавай для мяне была праца менавіта кіраўніка прадпрыемства. Ды і цяпер, на пасадзе старшыні аблвыканкама, праца цікавая, творчая.

Дачка сёлета закончыла школу і хоча вучыцца на юрыста. А сын заканчвае другі курс па той жа спецыяльнасці, што і я (эканоміка прыродакарыстання, сельскай гаспадаркі). Нядаўна пытаўся дазволу перавесціся на завочнае і пайсці працаваць у калгас. Атрымліваецца, бацька і дзед былі старшынямі калгаса, і яму туды хочацца. Праўда, з пераводам на завочнае навучанне я яго не падтрымаў. Павучыся, кажу, яшчэ два гады, і пойдзеш адукаваным працаваць.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■ Парламенцкі дзённік

# БЮДЖЭТ ВЫКАНАНЫ, АЛЕ ДЭПУТАТЫ МАЮЦЬ ПЫТАННІ...

**УЧОРА на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце, фінансах і падатковай палітыцы была разгледжана справаздача міністра фінансаў Рэспублікі Беларусь аб выкананні рэспубліканскага бюджэту за 2011 год. Праект закона аб зацвярджэнні гэтай справаздачы плануецца вынесці на абмеркаванне ніжняй палаты парламента 21 чэрвеня.**

Міністр нагадаў, што леташні бюджэт выконваўся ва ўмовах макраэканамічнага дысбалансу. Асноўнымі цяжкасцямі былі: высокая інфляцыя, валютны крызіс, адцягненне ўкладаў з банкаў, дэвальвацыя беларускага рубля, нізкі аб'ём прыцягнення прамых замежных інвестыцый і рост знешняй пазыкі. У гэтых умовах урад быў вымушаны прымаць складаныя і непапулярныя рашэнні, якія і дазволілі да канца года выраўнаваць сітуацыю, захаваць фінансавую сістэму краіны на плыву і на сённяшні дзень стварыць пэўную «падушку бяспекі».

Рэспубліканскі бюджэт за мінулы год быў выкананы з прафіцытам — даходы перавысілі выдаткі на 2,2 трл рублёў і склалі 0,8 працэнта да УВП (планаваўся дэфіцыт бюджэту ў 800 млрд рублёў або 0,3 працэнта УВП).

Асаблівасцю падатковай палітыкі ў 2011 годзе стала прывядзенне заканадаўства ў адпаведнасць з прававой базай Мытнага саюза, адмена 5 падаткаў і збораў, спрашчэнне збірання падаткаў. Па сутнасці, нягледзячы на цяжкія ўмовы, была рэалізавана рэформа падатковай сістэмы, адзначыў **міністр фінансаў Андрэй ХАРКАВЕЦ.**

Гэта не перашкодзіла дасягнуць і нават перавысіць запланаваны ўзровень даходу рэспубліканскага бюджэту, які склаў больш за 54 трл рублёў. Найбольшая ўдзельная вага ў агульнай суме даходаў належыць менавіта падаткам: 2,8 трл рублёў прынёс падатак на прыбытак, 18,7 трл — на дабаўленую вартасць, 15 трл — ад знешнеэканамічнай дзейнасці.

Прадастаўленыя падатковыя льготы і свабода ў вызначэнні парадку іх выплаты дазволілі зэканоміць абаротныя сродкі прадпрыемстваў. Разам з тым не ўсюды падатковыя льготы спрацавалі так, як чакалася, яны былі занадта вялікімі для некаторых буйных прадпрыемстваў, лічыць міністр, у сувязі з чым будуць унесены карэктывы.

Летась на рэдкасць поўна была выкарыстана выдатковая частка бюджэту — на 99,7 працэнта ад плана. Дадатковыя сродкі спатрэбіліся для захавання ўстойлівасці банкаўскага, падтрымкі рэальнага і бюджэтнага сектараў, індэксацыі заробкаў, павялічэння дапамог і стыпендый. Прынятыя захады дазволілі прадухіліць перарастанне валютнага крызісу ў банкаўскі, захаваць працаздольнасць многіх прадпрыемстваў і працоўныя месцы.

Цаной скарачэння фінансавання значнай часткі дзяржаўных праграм удалося падтрымаць самыя неабароненыя катэгорыі насельніцтва, цалкам забяспечыць усе выплаты па знешняй пазыцы і ў цэлым дасягнуць балансу ў макраэканоміцы краіны.

Даклад міністра фінансаў можна было ўспрыняць як канстатацыю няхай сабе і нягучнай, але ўсё ж такі перамогі кіраўніцтва краіны ў складаных абставінах. Тым не менш дэпутаты не прамінулі задаць шэраг «непрыемных» пытанняў, і на частку з іх яны атрымалі такія ж «непрыемныя» адказы.

— Чаму прычыны макраэканамічнага дысбалансу не былі прадугледжаны і не ўсе крызісныя з'явы былі прадухілены, — спытаў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Уладзімір КУЖАНАЎ.**

— Мы разам з вамі прымалі бюджэт, вы ўсе галасавалі за яго, — нагадаў Андрэй Харкавец. — Мы фарміруем яго, зыходзячы з параметраў макраэканамічнай палітыкі. Аднак усе мы ведаем, куды пайшла валюта і чаму...

— Колькі грошай выдаткоўвае дзяржава на ўтрыманне санаторыяў? — спытала міністра **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні Ларыса ВЕРШАЛОВІЧ**. — У найбольш запатрабаваныя часы — з вясны па восень — усе пуцёўкі закупляюцца замежнымі грамадзянамі. Сёння ёсць санаторыі, куды беларусам не патрапіць. Кошт для шараговага грамадзяніна нашай краіны не пад'ёмны...

Гэтае пытанне міністр паабяцаў разгледзець асобна. Ён пагадзіўся і з **намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і судова-прававых пытаннях Анфімам МІХАЛЕВІЧАМ**, які заўважыў, што для мясцовых уладаў эканомія сродкаў не выгадная.

— Эканомія важная, трэба яе фарміраваць яшчэ на стадыі планавання, — сказаў Андрэй Харкавец. — Але падобная эканомія не павінна мець нічога агульнага са скарачэннем фінансавання ў будучыні. Структура рэспубліканскага і мясцовага бюджэту паказвае, што мясцовыя бюджэты растуць ва ўдзельнай вазе, а рэспубліканскі застаецца стабільным. Мы спрабуем устанавіць парадак, аднак што тычыцца адносін паміж абласнымі і раённымі ўладамі, то тут хутчэй за ўсё адміністратыўныя метады кіравання не заўсёды спрацоўваюць на карысць мясцовых бюджэтаў...

Пагадзіўся міністр з дэпутатамі і ў пазіцыі магчымасці падняцця ставак акцызаў на тытунёвыя вырабы і алкаголь. Плануецца, што гэтыя акцызы будуць падняты да ўзроўню расійскіх.

Журналістам Андрэй Харкавец паведаміў, што сёлета бюджэт плануецца выканаць таксама з невялікім прафіцытам. Рост УВП на ўзроўні 5,5% цалкам рэальны. Разам з тым рост эканомікі павінен быць арыентаваны на ўнутраныя рэзервы краіны, лічыць міністр. Менавіта такія ўмовы будуць улічаны пры фарміраванні бюджэту на наступны год. Сёння міжнародныя крэдытныя рынкі не выгадныя не толькі для Беларусі, але і для іншых краін. Крэдыт Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС застаецца самым камфортным для фінансавай сістэмы нашай краіны. Перамовы па чацвёртым траншы гэтай пазыкі Беларусь плануе правесці ў верасні-кастрычніку 2012 года. «Умовы, якія нам выставяць, будуць не простыя, але мы ўжо ведаем, што ад нас хочуць», — сказаў міністр.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

# ПАРЛАМЕНТАРЫЗМ, ВЫБАРЫ І ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА.

## Беларусь рухаецца да новага палітычнага аблічча

**Уапошнія 2—3 тыдні неяк непрыкметна і без лішняга шуму беларускае грамадства зрабіла некалькі важных крокаў на шляху да рэформы сваёй палітычнай сістэмы. Перш за ўсё, гаворка ідзе пра даволі марудны, але паслядоўны працэс стварэння на падставе рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» палітычнай партыі.**

8 чэрвеня ў Віцебску прайшла справаздачна-выбарчая канферэнцыя Віцебскай абласной арганізацыі «Белая Русь». На ёй прысутнічаў і выступіў з дакладам член рэспубліканскай рады аб'яднання міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алег Праляскоўскі. На яго думку, стварэнне палітычнай партыі на падставе рэспубліканскага грамадскага аб'яднання дыктуецца самой логікай развіцця палітычнай прасторы Беларусі і постсавецкага рэгіёна. Сярод галоўных прычын гэтай трансфармацыі міністр пазначыў неабходнасць фарміравання ў Беларусі новых суб'ектаў публічнай палітыкі з усімі ўласцівымі для яе атрыбутамі: наяўнасцю экспертнай супольнасці, адзінай ідэалогіі, правядзеннем публічных дыскусій, адзінай інфармацыйнай і кадравай палітыкай. Галоўнай мэтай гэтага кроку з'яўляецца выкарыстанне патэнцыялу «Белай Русі» ў справе абароны і прасоўвання нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь як у Адзінай эканамічнай прасторы, так і ў больш шырокіх міжнародных фарматах.

Падчас канферэнцыі Віцебская абласная арганізацыя падтрымала ідэю пераўтварэння аб'яднання ў палітычную партыю.

Трэба адзначыць, што рашэнне віцебскіх актывістаў «Белай Русі» не з'яўляецца адзінкавым ці выпадковым. На працягу апошніх месяцаў ініцыятыву партыйнага будаўніцтва на падставе аб'яднання падтрымала Мінская абласная арганізацыя, цэлы шэраг раённых арганізацый. Шматразова заяўляў аб неабходнасці трансфармацыі лідар «Белай Русі» Аляксандр Радзькоў. Патрэбнасць у больш прафесійнай працы экспертаў, палітычных актывістаў, партыйных медыяструктур адзначыў і кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Макей у сваім дакладзе на 7-м беларускім міжнародным форуме.

Які ж сапраўдны палітычны змест стаіць за гэтымі заявамі? Чым абумоўлена патрэба ў развіцці партыйных структур у нашай краіне?

Калі паглядзець на краіны з моцнай прэзідэнцкай уладай і параўнальна невялікай роляй парламента (як, напрыклад, Расія ці Казахстан), то становіцца відавочным, што нават у іх палітычным жыцці парламенцкія і непарламенцкія партыі адыгрываюць значную ролю ў легітымізацыі найбольш значных рашэнняў, правядзенні кадравай палітыкі, рэалізацыі міжнародных кантактаў, папярэднім экспертным абмеркаванні дыскусійных пытанняў. Сэнс палітычных партый — у тым, каб розныя пазіцыі, што існуюць у грамадстве і абумоўлены сацыяльнай, прафесійнай, тэрытарыяльнай прыналежнасцю, ідэалагічнымі перавагамі і светапоглядам іх носьбітаў, былі знешне выказаны, зроблены публічнымі. Гэта разглядаецца як перадумова для іх уліку ў працэсе распрацоўкі і прыняцця рашэнняў як уладамі, так і іншымі суб'ектамі, ад якіх залежыць дабрабыт адпаведных сацыяльных груп.

Палітычныя партыі з'яўляюцца неабходнымі і ў камунікацыі на міжнароднай арэне, калі ў краіны ёсць неабходнасць адзначыць нейкую пазіцыю, але з тых ці іншых прычын гэта немагчыма зрабіць на афіцыйным узроўні. Трэба адзначыць, што ў адносінах з нашымі бліжэйшымі партнёрамі — і перш за ўсё Расіяй — падобныя сітуацыі ўзнікалі шматразова. Але амаль заўсёды абараняць дзяржаўныя пазіцыі ў іх даводзілася прадстаўнікам міністэрстваў і іншых дзяржаўных структур, якія ў сваіх заявах вымушаны былі абмяжоўвацца патрабаваннямі пратакола. Шэраг грамадскіх аб'яднанняў Беларусі, у тым ліку «Белая Русь», таксама заяўлялі сваю палітычную пазіцыю ў падобных канфліктных сітуацыях. Але ж голас грамадскіх аб'яднанняў, у адрозненне ад партыйнай пазіцыі, не мае палітычнага статусу.

Таму патрэбнасць ва ўтварэнні моцнай партыйнай сістэмы ў нашай краіне відавочная. Беларусь павінна быць прадстаўлена на належным узроўні і ў экспертнай супольнасці, і ў прасторы партыйнай палітыкі. Акрамя таго, аб'яднанне ўсіх членаў «Белай Русі», якія трапілі ў парламент, адзіным палітычным цэнтрам і патрабаваннямі партыйнай дысцыпліны нават без дадатковых крокаў па рэфармаванні палітычнай сістэмы павялічыць палітычную ролю беларускага парламента. Але з другога боку, гэта сітуацыя будзе несці і адпаведныя рызыкі.

І ў гэтым сэнсе мудрым, палітычна і юрыдычна карэктным выглядае рашэнне кіраўніцтва краіны і РГА «Белая Русь» не пачынаць палітычную рэформу да парламенцкіх выбараў у верасні 2012 года. Справа не толькі ў тым, што гэтае рашэнне адпавядае рэкамендацыям АБСЕ і дазваляе пазбегнуць дадатковай крытыкі з боку «дэмакратычнай супольнасці» (як «хатняй», так і міжнароднай).

Пераўтварэнне «Белай Русі» ў партыю і рэалізацыя палітычнай рэформы пасля парламенцкіх выбараў азначае, у першаю чаргу, што «спроба сіл» новай партыі будзе адбывацца на прэзідэнцкіх выбарах 2015 года. То бок, у якасці палітычнай партыі «Белая Русь» будзе дэбютаваць як партыя падтрымкі Прэзідэнта. А гэта з'яўляецца гарантыяй захавання адзінства ўлады ў новай канфігурацыі палітычнай сістэмы, якія б канкрэтныя рысы ні былі ёй нададзены ў канцы 2012 і ў 2013 гадах.

Другі, не менш важны аспект гэтай палітычнай сітуацыі — у тым, што «адтэрміноўка» палітычнай рэформы дае «Белай Русі» (а таксама іншым грамадска-палітычным структурам Беларусі) час, неабходны для распрацоўкі партыйнай ідэалогіі. Для «Белай Русі» вырашэнне гэтай задачы неабходна не толькі для паспяховых дзеянняў на першых парламенцкіх выбарах «па новых правілах» прыкладна ў 2016 годзе, але і для таго, каб наогул не знікнуць і набыць свой унікальны палітычны воблік у 2013—2014 гадах. Акрамя таго, фарміраванне палітычнай ідэалогіі і пазіцыі новай партыі будзе неабходным і для таго, каб Беларусь была з годнасцю прадстаўлена ў Еўразійскім парламенце, праект якога нядаўна абмяркоўваў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка са старшынёй расійскага Савета Федэрацыі Валянцінай Мацвіенка.

Такім чынам, у бліжэйшы час Беларусь пабачыць істотныя змены ў сваім палітычным жыцці. Правільны выбар прыярытэтаў у працэсе рэалізацыі гэтых змен можа стаць падставай для канкурэнтаздольнасці краіны на міжнароднай арэне ў наступныя 5—10 гадоў.

**Юры ЦАРЫК, палітычны аналітык, кіраўнік Грамадскага прэс-цэнтра Дома прэсы.**

# БАНКІ АГІТУЮЦЬ НА КАРЫСЦЬ ПЛАСТЫКАВЫХ КАРТАК

**«Беларусбанк» і кампанія Visa адправілі двух беларусаў на Алімпіяду ў Лондане: турыстычны пакет на дваіх з наведваннем цырымоніі закрыцця выйграў Алег Чарны з Мінска (у рэкламнай гульні «Насустрач алімпійскаму Лондану!»), а ў акцыі «Не ўпусці паездку на Алімпіяду!» тур на дваіх выйграў Аляксандр Архіпенка з Салігорска.**



— Я карыстаюся пластыкавымі картамі больш за 10 гадоў, — расказаў журналістам **Алег ЧАРНЫ.** — І паступова ішоў да таго, што з простай Visa Electron у мяне стала картка Visa Gold. Бо я лічу, што кожны мужчына павінен мець картку Visa Gold, добры гадзіннік і добрыя аксесуары. Калі пазванілі і сказалі пра выйгрыш, то я спачатку падумаў, што гэта «развод»: я шмат чытаў пра выпадкі, калі «разводзяць» па тэлефоне. Але потым усё ўдакладніў і паверыў. Алег Леанідавіч таксама расказаў, што звычайна толькі 10-15% грошай здымае з карткі ў банкамаце, астатнія ж плацяжы праводзіць безнаяўным парадкам.

— Мы папулярызуем выкарыстанне плацежных картак у паўсядзённым жыцці, а не толькі ў дзень заработнай платы, — кажа **Ілья ШАЛАНКІ, намеснік старшыні праўлення ААТ «ААБ Беларусбанк»**. — Традыцыйна масавыя плацяжы людзі стараюцца зрабіць у аддзяленні банка, а гэта ўсё-такі асабісты час кожнага, які можна выкарыстаць больш плённа і для сябе, і для сям'і. Таму мы хочам, каб масавыя плацяжы ажыццяўляліся з дапамогай пластыкавых картак. Ужо сёння амаль чвэрць (23%) ад аб'ёму ўсіх аперацый пры дапамозе пластыкавых картак ажыццяўляецца ў безнаяўнай сферы. Але мы ставім для сябе вельмі амбіцыйныя задачы — каб усе масавыя плацяжы рабіліся такім чынам.

Па словах намесніка старшыні праўлення, «Беларусбанк» зараз абслугоўвае каля 4,5 млн пластыкавых картак і мае дастаткова развітую інфраструктуру — больш за 1 тыс. інфакіёскаў і банкаматаў на тэрыторыі ўсёй краіны. У тым ліку і ў невялікіх паселішчах. Апошнім часам малы бізнэс стварае інфраструктуру для прыёму пластыкавых картак у сваіх пакупнікоў, у тым ліку і індывідуальныя прадпрымальнікі.

Пару гадоў таму ішла гаворка пра аб'яднанне банкаматаў розных банкаў у адну сетку, каб карыстальнік пластыкавай карткі не шукаў банкамат свайго банка, а зняў бы грошы ў любым банкамаце без камісіі. «Звязда» пацікавілася ў Ілы Шаланкі, наколькі гэта рэальна:

— Наш банк сёння мае партнёраў, у банкаматах якіх можна здымаць грошы без камісіі. Каб аб'яднаць усе банкаматы, павінна быць сустрэчнае жаданне ўсіх банкаў, бо адной ініцыятывы з боку «Беларусбанка» будзе недастаткова.

Ён лічыць, што простае аб'яднанне банкаматаў можа выклікаць утрыманства, калі некаторыя банкі будуць праводзіць эмісію пластыкавых картак, але не развіваць інфраструктуру.

— Безумоўна, у ідэале кліент не павінен адчуваць нейкую там нязручнасць і несці фінансавыя страты. Таму ўсе банкі павінны рухацца ў гэтым кірунку, павінны развіваць сваю інфраструктуру, можа, на парытэтных асновах. Я мяркую, што рана ці позна такія планы спраўдзяцца, тым больш што ў асноўным усе банкі працэсіруюцца праз ААТ «Банкаўскі працэсінгавы цэнтр».

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## БЕЛАРУСЫ ЧАСЦЕЙ ЗА ЎСЁ ВЫБІРАЮЦЬ МАБІЛЬНІКІ АД 100 ДА 300 У.А.

**Трыццаць тры працэнты ад усіх прададзеных мабільных прылад у другім квартале 2012 года — тэхніка фірмы «Самсунг». Пра гэта журналістам паведаміла прадстаўніцтва кампаніі Samsung Electronics Rus у Беларусі на прэзентацыі новага смартфона Samsung Galaxy S III. Па іх словах, жыхары Беларусі ў асноўным купляюць мабільныя тэлефоны маркі Samsung у сярэднім цэнавым дыяпазоне — коштам ад 100 да 200 і ад 200 да 300 умоўных адзінак.**

Што тычыцца больш дарагіх мабільных прылад, то доля смартфонаў у агульных продажах мабільнікаў на беларускім рынку складае каля 40%. Але па выніках першага і другога кварталаў 2012 года, адзначаюць у прадстаўніцтве «Самсунга», назіраецца рост продажаў «разумных тэлефонаў». І карэйская кампанія нават прагназуе, што на працягу 2012 года гэтая доля можа павысіцца ажно да 60 працэнтаў.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

■ Прамая лінія

# ПРАБЛЕМЫ З СЭРЦАМ — З-ЗА ДЭПРЭСІІ?

**На пытанні чытачоў адказала загадчыца інфарктнага аддзялення №2 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, урач-кардыёлаг вышэйшай катэгорыі Наталля ПАЛЯЎКОВА.**

*(Працяг. Пачатак у нумары за 16 чэрвеня.)*

***☎— Мінск, Тамара Ільінічна. Мужу — 62 гады. Ішэмія, кардыясклероз аорты, ужо гадоў, можа, дзевяць, мігальная арытмія. Пазалетась з арытміяй некалькі разоў трапляў у бальніцу. Ціск 160/90. Пастаянна прымае таблеткі. Частата сардэчных скарачэнняў — 48-62. Калі здараецца вышэй за 62, яму дрэнна, ён ужо ў паніцы. Падкажыце, як зрабіць, каб частата сардэчных скарачэнняў не ўзнімалася вышэй за 62?.. Яшчэ ў мужа катаракта, павінны былі апераваць у 3-й клініцы, але ж ціск быў 140/80 і аперацыю адмянілі. Як дабіцца нармальнага ціску? Прымае амідарон, трызідзін, лізінапрыл, каптапрыл, аспаркам, ацэцілсаліцылавую кіслату.***

— Для таго, каб правільна адказаць на ваша пытанне, неабходна ведаць, у якіх дозах ваш муж прымае прэпараты. Акрамя таго, неабходна бачыць вынікі электракардыяграмы, паколькі павелічэнне дозы можа выклікаць ускладненні. Пры пастаяннай форме мігальнай арытміі неабходны прыём сардэчных гліказідаў, напрыклад, дыгаксіну. Да медыкаментознай тэрапіі можна дадаць яшчэ чай з мятай, кветкамі глогу, адвар пладоў глогу — без перапынку на працягу 10 дзён па адным кубку ў дзень у разліку 1 ст. л. травы на шклянку вады.

***☎— Карэліцкі раён, Мікалай Леанідавіч. 77 гадоў. Хацелася б прачытаць аб тым, які рэжым працы і ў цэлым жыцця трэба вытрымліваць пры стэнакардыі напружання з задышкай? З лекаў прымаю такія прэпараты, як бісапралол — 10, дыласідом — 4, амладыпін, лізінапрыл — па 10 двойчы, кардыямагніл — 75 на ноч. У жонкі таксама ёсць стэнакардыя, але ж без задышкі... Што рабіць, калі ёсць задышка?***

— Далучэнне задышкі можа сведчыць аб сардэчнай недастатковасці. Да вашай схемы лячэння неабходна дадаць мачагонныя прэпараты. Прэпарат і дазіроўку падбірае лечачы ўрач з улікам інфармацыі абследавання — агляду, ультрагукавога абследавання сэрца, рэнтгену лёгкіх. Акрамя таго, неабходна абавязкова звярнуць увагу на колькасць солі ў вашым рацыёне, паколькі салявая дыета спрыяе дэкампенсацыі сардэчнай недастатковасці.

***☎— Сенненскі раён, Аляксандр Іванавіч. 54 гады. Сціскаючы боль у вобласці сэрца недзе ўжо каля года. Калі крыху паварочаць галавой, узнікае галавакружэнне, час ад часу адчуваю скурныя дрыжыкі. Бліжэй да вечара ацякаюць ногі. Ціск верхні — 150-160, ніжні — 74-90.***

— У вас, безумоўна, ёсць артэрыяльная гіпертэнзія 1-й ступені. Неабходна зніжаць артэрыяльны ціск з дапамогай рэжыму працы, змянення характару харчавання. Абавязкова ўключыце ў свой штодзённы рацыён раслінную ежу, салаты з самай рознай гароднiны, рыбу, нятлустае варанае мяса. Неабходна абмежаваць салёныя, кансерваваныя, тлустыя прадукты, жывёльныя тлушчы. У штодзённым рацыёне павінна быць не больш за 3-4 г солі з улікам гатовых прадуктаў, якія звычайна змяшчаюць немалую колькасць солі. Садавіны і гародніны, акрамя бульбы, павінна быць 400-500 г.

З такімі лічбамі артэрыяльнай гіпертэнзіі неабходна прымяненне медыкаментаў. Для таго, каб устанавіць прычыну галаўных боляў і боляў у сэрцы, неабходна зрабіць здымак шыйна-груднога аддзела пазваночніка, ультрагукавое даследаванне сасудаў шыі, электракардыяграму, біяхімічны аналіз крыві. Калі ласка, не зацягвайце з абследаваннем.

***☎— Мінск, Міхаіл Іванавіч. 72 гады. Ціск — 130/85. Падчас нагрузкі пульс павышаецца да 105, а ў спакойным стане — 69. Прымаю эналапрыл... Хвалюе павышэнне пульсу, што з гэтым рабіць?***

— Вы не ўказваеце, ці выклікае пачашчэнне пульсу нейкія скаргі... Верагодней за ўсё, раней вы гэтага проста не заўважалі. Магчыма, у вас ёсць ішэмічная хвароба сэрца і развіваецца сардэчная недастатковасць. Таму вам неабходна дадаць да лячэння аспірын і бэтаблакатары — метапралол, бісапралол, небівалол. Для таго, каб дзейсна змагацца з захворваннем, патрабуецца выкананне канкрэтных рэкамендацый урача, не зацягвайце з візітам.

***☎— Баранавічы, Лідзія Іванаўна. 75 гадоў. Дыягназ — гіпертанія, гады тры поўная блакада. П'ю лазарпам, сіднафарм. Ці дастаткова гэтага пры маім стане?***

— Да вашай схемы лячэння неабходна дадаць аспірын. Вядома, калі няма такіх супрацьпаказанняў, як язвавая хвароба або непераноснасць. Можна дадаць трымецізідзін (трызідзін М, прэдуктал М — 35 мг) двойчы на дзень на працягу 1-3 месяцаў.

***☎— Капыльскі раён, Ганна Рыгораўна. 71 год. Інвалід 2 групы, дыябет 2 ступені, ішэмія, стэнакардыя, сардэчная недастатковасць. Праз месяц трапляю ў рэанімацыю. Задышка такая, што проста немагчыма... Прымаю раніцай і вечарам манакапс, метапралол, лізінапрыл, нітрамінт, клафелін, калі трэба збіць ціск... Што вы параіце пры маім стане?***

— Шаноўная Ганна Рыгораўна. Не губляйце аптымізму... На жаль, я не ведаю даных вашай электракардыяграмы. Магчыма, там зафіксавана арытмія, і тады неабходны прэпараты, якія на яе паўплываюць. Таксама неабходныя сардэчныя гліказіды. Неабходна і пастаянная карэкцыя цукру крыві і яе ўтрыманне на лічбах кампенсацыі цукровага дыябету. Глюкоза крыві павінна быць на ўзроўні 6-8 ммоль/л. У вашай схеме лячэння не хапае яшчэ аспірыну, які папярэджвае развіццё інфаркту міякарда.

***☎— Мінская вобласць, Святлана Сяргееўна. Часам кажуць, што з прафілактычнай мерай пасля 40 гадоў усім трэба піць аспірын. Ці так гэта?***

— Прымаць чвэрць таблеткі аспірыну рэкамендуюць тым, хто трапіў у групу рызыкі па развіцці ішэмічнай хваробы сэрца. Гэта асобы ва ўзросце пасля 50 гадоў, у якіх ёсць адпаведная спадчыннасць, павышаны артэрыяльны ціск, павышаны ўзровень халестэрыну або пэўныя першыя праявы ішэміі. Піць аспірын проста ўсім і кожнаму нельга, паколькі так можна спрафілактаваць адно і набыць іншае захворванне, напрыклад, гастрыт або язву. Тым, каму аспірын паказаны, трэба разжоўваць яго штодня пасля вячэры.

***— Мы неяк спрабавалі мераць дзіцяці ціск і ўсхваляваліся надта нізкімі лічбамі...***

— Калі дзіця здаровае, няма неабходнасці мераць яму ціск і хвалявацца з нагоды таго, што незразумела. Дастаткова вадзіць дзіця на прафілактычныя агляды. Калі ж у дзіцяці з'явіўся, скажам, галаўны боль, то што дасць ваша вымярэнне ціску? Без спецыяліста ўсё роўна не абысціся. А ў прынцыпе, у дзяцей лічбы ціску крыху ніжэйшыя.

***☎— Смаргонь, Тамара. Ці сапраўды пры нізкім ціску можна і трэба піць каньяк і каву?***

— Ва ўмеранай дозе гэта не супрацьпаказана. Гэта можа быць чайная лыжка каньяку на чайную лыжку кавы. Калі пры гэтым, вядома, няма тахікардыі, здаровы страўнік і г.д... Наогул для гіпертоніка са стажам нізкім будзе ціск нават на ўзроўні 120. Звычайна ж нізкім лічыцца ціск меншы за 90 мм. рт. сл. (верхні) і ніжэй за 60 (ніжні), гэта ўжо гіпатанічная хвароба, якая суправаджаецца адпаведнай клінікай — слабасцю, дрэнна пераносіцца фізічная нагрузка. Праўда, заўсёды трэба ўлічваць індывідуальныя асаблівасці... З цягам часу гіпатонікі, як правіла, становяцца гіпертонікамі, паколькі ўсё роўна з'яўляецца атэрасклероз. Атэрасклератычныя бляшкі робяць сасуды калянымі, і ціск усё роўна з-за гэтага будзе павышацца. І як правіла, верхні ціск пачынае павышацца — з-за атэрасклерозу аорты, а ніжні можа заставацца нізкім. Такое нярэдка назіраецца ў старых людзей. Прычына — у звужэнні аорты або недастатковасці работы артальных клапанаў, што таксама з'яўляецца ўзроставым змяненнем.

***— Ці можна займацца спортам у момант павышанага або паніжанага ціску?***

— Тут найперш будзе мець значэнне самаадчуванне. Калі нізкі ціск пераносіцца нармальна, то можна не адмяняць фізічныя заняткі. А вось пры павышаным ціску дадаваць нагрузку на сасуды не варта. У лепшым выпадку трэба проста пахадзіць пешшу, а інтэнсіўныя трэніроўкі лепей адкласці.

**Святлана БАРЫСЕНКА**
***(Заканчэнне будзе.)***

■ Геапалітыка

# ШАКІРУЮЧАЯ БУДУЧЫНЯ АМЕРЫКАНСКАЙ ДЭМАКРАТЫІ

**Амерыканская сістэма кіравання з'яўляецца самай разрэкламаванай у свеце. У многіх краінах з захапленнем і прыдыханнем глядзяць на ЗША і спрабуюць капіраваць амерыканскі досвед. Але пры гэтым яны не ўлічваюць падводных камянёў амерыканскай сістэмы кіравання, як, зрэшты, і падобных уразлівых месцаў большасці заходніх дзяржаў. Карупцыя, няправільнае збіранне падаткаў і іх размеркаванне здольныя тарпедаваць ЗША.**

Яшчэ ў 2008 годзе я пісаў, што дэмакратыя і дэмакратычныя інстытуты ў заходніх краінах развіваюцца і захоўваецца стабільнасць у многім за кошт гнуткай сістэмы пераразмеркавання сродкаў паміж усімі зацікаўленымі бакамі. Мільярдэры і мільянеры занадта вольна абыходзяцца з дзяржаўнымі і прыватнымі фінансамі, не саромеючыся запусціць руку ў чужую кішэнь; прадстаўнікам беднаты, меншасцяў і беспрацоўным выплачваюцца шчодрыя дапамогі, каб пазбегнуць сутыкненняў на міжнацыянальнай і класавай глебе, а сярэдні клас становіцца асноўным донарам і для багатых, і для бедных.

Пры гэтым у выніку глабалізацыі самастойнасць ад сваіх урадаў багатых грамадзян заходніх краін усё больш узрастае і яны ўжо не жадаюць плаціць вялікія падаткі. Навошта ім гэта? Яны могуць лёгка перамясціцца ў іншую краіну Захаду з меншым падаткаабкладаннем, калі свой урад хоча ўзяць з іх вялікія падаткі. Заходнія дзяржавы ў выніку вымушаны ісці на ўступкі самым багатым грамадзянам, зніжаючы для іх падаткі, каб не дапусціць ад'езду.

Але працэсы глабалізацыі прыводзяць і да значнага змяншэння сярэдняга класа ў заходніх краінах. Я меркаваў, што можа скласціся сітуацыя, калі падаткаў з сярэдняга класа стане недастаткова для забеспячэння існуючай сістэмы пераразмеркавання сродкаў, а вышэйшы клас будзе абаронены ад павышэння падаткаў як за кошт пастаянна нарастальнага ўплыву на ўрад, так і за кошт лёгкага перамяшчэння ў іншыя дзяржавы. Пры гэтым ён зусім не адмовіцца ад звычак жыць за кошт чужых сродкаў.

Рэзкае скарачэнне сацыяльных праграм у спробе ўрэгуляваць бюджэт, які раздзіраюць на часткі, можа прывесці да росту пратэстнага патэнцыялу беднаты і нацыянальных меншасцяў, што ва ўмовах нарастальнай этнічнай разнароднасці і сацыяльнай палярызацыі краін Захаду можа справакаваць паўстанні і бунты, якія разбураць казку аб сацыяльнай гармоніі і будуць рэгулявацца зусім не дэмакратычнымі метадамі. Але гэта было напісана ў 2008 годзе ў якасці тэарэтычнага прадказання. А што адбываецца ў 2012-м?

Шакіруючай навіной для шматлікіх амерыканцаў сталі свежыя звесткі, прадстаўленыя ў справаздачы Федэральнай рэзервовай сістэмы ЗША «Survey of Consumer Finances». Як высветлілася, дабрабыт сярэдняй амерыканскай сям'і ўпаў у 2010 годзе да мінімальнага ўзроўню з 1992 года. Пры гэтым асноўны ўдар прыйшоўся на сярэдні клас, прыбыткі якога толькі за тры гады ўпалі на 12,1 адсотка. Для параўнання: прыбыткі самых багатых сем'яў знізіліся ўсяго на 1,4%.

Калі падобны працэс не ўдасца спыніць і значная частка сярэдняга класа ЗША паступова трансфармуецца ў маламаёмных, глядзіш, справа можа дайсці і да прадказаных праблем з фінансаваннем бедных пластоў насельніцтва і сацыяльных хваляванняў.

На фоне гэтай навіны трывог дадае і свежы вынік судовага працэсу над вядомым амерыканскім мільярдэрам. Ален Стэнфард быў прыгавораны да 110 гадоў турэмнага зняволення за махлярства. На працягу 15 гадоў падпарадкаваны яму банк займаўся непрыкрытым махлярствам, выкраўшы больш як 7 мільярдаў долараў, падкупляючы кантралюючыя і правяраючыя органы, каб злачынныя схемы не выявіліся.

Не варта забываць і аб тым, што толькі сусветны фінансавы крызіс дазволіў выявіць і іншую аналагічную фінансавую піраміду, створаную амерыканскім мільярдэрам Бярнардам Мэдофам, якая паглынула 65 мільярдаў долараў за 20 гадоў, за што ён цяпер і пачаў адбываць тэрмін у 150 гадоў.

Ёсць сур'ёзныя падставы лічыць, што гэта толькі верх айсберга, і занадта вольна з дзяржаўнымі і прыватнымі фінансамі аперыруюць і дзясяткі іншых амерыканскіх мільярдэраў. Пры гэтым яны люта супраціўляюцца спробам Абамы абкласці іх больш высокімі падаткамі, абапіраючыся на Рэспубліканскую партыю. Так, 17 красавіка 2012 года спроба Абамы падняць падаткі для багатых праз спецыяльны законапраект была пры дапамозе рэспубліканцаў паспяхова правалена. І збяднелы сярэдні клас зноў застаўся асноўным донарам сацыяльных праграм.

Такім чынам, даходы сярэдняга класа зніжаюцца да дваццацігадовых мінімумаў, вышэйшы клас надзвычай вольна абыходзіцца з фінансамі і не хоча плаціць сур'ёзных падаткаў, у той час як дзяржаўны доўг расце нечуванымі раней тэмпамі, што можа вельмі сумна скончыцца для Амерыкі. Радавацца гэтаму не варта, паколькі, як пераканаўча паказаў 2008 год, любыя праблемы Амерыкі тут жа становяцца праблемамі ўсяго свету.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук, загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь**

■ Калонка ДАІ

# ЗОНА КАНТРОЛЮ,
## або Ці адвучаць беларусаў ліхачыць на дарогах

**Ахвотнікам празмерна хуткай язды, па ўсім відаць, хутка давядзецца развітацца са сваёй звычкай. З 1 ліпеня рух на галоўнай аўтастрадзе краіны Брэст— Мінск—мяжа Расійскай Федэрацыі (М-1) пачне дзейнічаць аўтаматычная сістэма фотавідэафіксацыі.**

Старшы інспектар Упраўлення дзяржаўнай аўтаінспекцыі МУС Беларусі Станіслаў Салавей прадэманстраваў прынцып яе работы. Зрэшты, вельмі просты і празрысты. Спецыяльныя камеры фіксуюць перавышэнне хуткасці аўтамабільным сродкам. З дапамогай featуровага ўзроўню фотаўспышкі камера выдае два фотаздымкі — дарэчы, вельмі выразныя, незалежна ад таго, зроблены яны днём ці ноччу. На адным з іх выява рэгістрацыйнага нумара аўто. На другім — яго марка, мадэль і колер.

«Здымкі і звесткі аб парушэнні рэжыму хуткасці перадаюцца ў адзіны цэнтр апрацоўкі. На кожнае правапарушэнне складаецца асобны адміністрацыйны пратакол з унікальным рэгістрацыйным нумарам», — растлумачыў старшы інспектар.

Дарэчы, калі да нядаўняга часу да адказнасці прыцягваўся сам вадзіцель, то цяпер, згодна з нарматыўна-прававой базай, — уласнік машыны. Непасрэдна яму і накіроўваецца адпаведная пастанова аб парушэнні. Але ён мае права звярнуцца ў тэрытарыяльнае падраздзяленне Дзяржаўтаінспекцыі з заявай, што ў гэты час за рулём знаходзіўся іншы чалавек, і прадаставіць пераканаўчы доказ у пацвярджэнне сваіх слоў. Прынамсі, гэта можа быць і пісьмовае прызнанне самога парушальніка. У гэтым выпадку ён будзе аштрафаваны. Што тычыцца юрыдычных асоб, то тут таксама ўсё прадугледжана. Супрацоўнікі цэнтра накіроўваюць суб'екту гаспадарання запытанне. Кіраўнік абавязаны паведаміць анкетныя звесткі кіроўцы, які «засвяціўся» на дарозе ва ўказаны час. Пасля атрымання адказу вадзіцель прыцягваецца да адміністрацыйнай адказнасці. Складаней з замежнымі грамадзянамі, якія ігнаруюць правілы хуткаснага рэжыму. Але праскочыць цераз мяжу ім непрыкметна не ўдасца. Інфармацыя аб кожным асобным парушэнні будзе ўносіцца ў адзіную базу, а транспарт з замежнымі нумарамі — звярацца з ёй пры перасячэнні дзяржаўнай мяжы. На мяжы будуць абсталяваны спецыяльныя вагончыкі — пункты кантролю аплаты, дзе замежных ліхачоў азнаёмяць з зафіксаваным фактам. Тут жа, праз тэрмінал, яны могуць заплаціць штраф — як валютай, так і беларускімі рублямі, наяўнымі грашыма ці банкаўскай карткай. Калі ж замежны грамадзянін адмаўляецца ўносіць патрэбную суму, то закон дазваляе забраць у яго вадзіцельскае пасведчанне. Ёсць і іншыя механізмы ўздзеяння на нязгодных — напрыклад, такія, як забарона на ўезд на тэрыторыю Беларусі.

Грамадзяне Беларусі павінны добраахвотна заплаціць штраф праз любы банк або з дапамогай інтэрнэт-рэсурсаў на працягу месяца. У выпадку адмовы пастанова накіроўваецца ў суд.

За перавышэнне хуткасці ад 10 да 20 км у гадзіну давядзецца ўнесці 0,5 базавай велічыні (БВ), ад 20 да 30 — 1, ад 30 і вышэй — 3 БВ. Нагадаю, адна базавая велічыня — 100 тыс. рублёў. Пры аналагічным паўторным парушэнні на працягу года давядзецца раскашэліцца на 5 базавых.

Усяго на галоўнай шашы нашай краіны ўстаноўлена 15 стацыянарных сістэм фотавідэафіксацыі, якія працуюць у тэставым рэжыме. Зона кантролю вызначана спецыяльным знакам. Абвінаваціць супрацоўнікаў ДАІ ў тым, што яны працуюць толькі дзеля таго, каб папоўніць дзяржбюджэт, цяжка. «Наша задача не ў тым, каб сабраць больш штрафаў, а навесці парадак на дарогах, прывучыць вадзіцеляў да бяспекі руху, не дапусціць гібелі людзей», — запэўніў намеснік начальніка службы прафілактыкі і прапаганды бяспекі дарожнага руху спецпадраздзялення «Страла» МУС Беларусі Андрэй Ігнатовіч. — Менавіта гэтыя папярэджанні стрымліваюць пыл ліхачоў, бо яны баяцца трапіць у зону кантролю».

У бліжэйшай перспектыве тут з'явіцца яшчэ 10 камер. А з цягам часу іх колькасць павялічыцца. Такімі сістэмамі плануецца абсталяваць усе дарогі рэспубліканскага прызначэння. Як адзначыў Станіслаў Салавей, практычна ўсе яны знаходзяцца ў добрым стане і дазваляюць хуткую язду, таму патрабуюць карпатлівага кантролю. Разам з тым, на яго думку, аўтаматызаваныя сістэмы на нашых дарогах не заменяць радарны кантроль, а толькі ўзмоцняць яго.

Варта дадаць, што супрацоўнікі ДАІ маюць на ўзбраенні яшчэ і дзве пераносныя сістэмы фотафіксацыі руху, якія можна размясціць ў аўтамабілі ці любым месцы шашы. Яны могуць паўнацэнна функцыянаваць і на іншых дарогах.

На пытанне, чаму менавіта аўтатраса Брэст—Масква выбрана для ўстаноўкі новых сістэм, старшы інспектар адказаў, што яна самая працяглая і небяспечная. Штогод тут гінуць 60 чалавек, яшчэ 150 атрымліваюць цялесныя пашкоджанні у выніку аварыі ці пад коламі аўтамабіля.

Варта дадаць, што ў тэставым рэжыме камеры штотыдзень фіксуюць 6 тыс. фактаў перавышэння хуткасці. Пакуль штрафныя санкцыі да кіроўцаў не прымяняліся, аднак супрацоўнікі ДАІ маюць намер прыцягнуць да адказнасці найбольш заўзятых ліхачоў. У прыватнасці, адзін з іх развіў хуткасць 265 кіламетраў у гадзіну.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

## 10-І 20-РУБЛЁВЫЯ БАНКНОТЫ БУДУЦЬ НЕСАПРАЎДНЫЯ З 1 КРАСАВІКА 2014 ГОДА

Згодна з пастановай праўлення Нацбанка ад 31 мая 2012 года, банкноты Нацыянальнага банка наміналам 10 і 20 рублёў узору 2000 года застаюцца ў абарачэнні да 28 лютага 2013 года — да гэтага часу імі можна расплачвацца пры ўсіх відах плацяжоў без усялякіх абмежаванняў. Пасля гэтай даты расплаціцца «дзясятачкамі» і «дваццатачкамі» ў крамах будзе нельга, але з 1 сакавіка 2013 па 30 верасня 2013 года іх можна будзе памяняць на іншыя купюры ў банках краіны і ў першую чаргу, у Нацыянальным банку. Хто не паспее, то з 1 кастрычніка 2013 па 31 сакавіка 2014 года — толькі ў Нацыянальным банку. А ўжо з 1 красавіка 2014 года гэтыя банкноты будуць лічыцца несапраўднымі і будуць мець каштоўнасць хіба што толькі для нумізматаў.

Такім чынам, вывад з абарачэння дробных купюр павінен адбыцца паступова і безбалюча, тым больш што з 1 верасня 2012 года Нацбанк спыняе іх выпуск у абарачэнне. Як патлумачылі ў прэс-службе, адмаўленне ад 10-і 20-рублёвых купюр было зроблена «з мэтай скарачэння дзяржаўных выдаткаў на іх выраб», а таксама з «немэтазгоднасцю іх далейшага выкарыстання ў наяўным грашовым абарачэнні».

**Павел БЕРАСНЕЎ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Эксперымент з фінансаваннем у школах: чаму не варта спяшацца?

**ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі накіраваў у Міністэрства адукацыі сваю пазіцыю наконт запланаванага правядзення ў краіне эксперымента па пераходу да фінансавання агульнай сярэдняй адукацыі на падставе нарматыву бюджэтнай забяспечанасці на навучанне і выхаванне аднаго навучэнца. Размова ідзе пра ўкараненне «падушавой» сістэмы аплаты працы накшталт той, што ўжо дзейнічае ў Расіі, дзе грошы ў выглядзе ваўчара прывязваюцца да канкрэтнага дзіцяці. Фінансаванне такім чынам ідзе следам за вучнем, прымушаючы педагогаў змагацца за кожнае дзіця.**

Для таго, каб быць гатовымі да работы ў новых умовах, пры ЦК галіновага прафсаюза была створана рабочая група па вывучэнні ўдасканалення механізма фінансавання ўстаноў адукацыі і магчымага пераходу на новую сістэму аплаты працы педагагічных работнікаў. Члены рабочай групы выязджалі ў Расійскую Федэрацыю, у прыватнасці, вывучалі досвед работы калег з Масквы, Маскоўскай, Бранскай і Смаленскай абласцей. На падставе праведзенай работы была падрыхтавана аналітычная запіска.

На думку яе аўтараў, эксперымент магчымы толькі пры яго лакалізацыі, гэта значыць, для правядзення эксперыменту трэба задзейнічаць 2-3 установы адукацыі рознага тыпу ў вызначаных раней абласцях і ў сталіцы. Улічваючы лакалізацыю эксперымента, пры яго правядзенні **вызначэнне нарматыву фінансавання павінна ажыццяўляцца не ад дасягнутага, а ад неабходнага з улікам дзеючых у агульнай сярэдняй адукацыі стандартаў.** Нарматыў павінен уключаць складнікі як навучання, так і выхавання, у тым ліку наяўнасць адпаведных штатных адзінак (педагогаў-псіхолагаў, сацыяльных педагогаў, педагогаў-арганізатараў), правядзенне факультатыўных, гуртковых і іншых заняткаў, стварэнне груп падоўжанага дня. Нарматывам таксама павінны быць улічаны тыповыя штаты, дзеючая сістэма аплаты працы, матэрыяльнае стымуляванне, матэрыяльная дапамога ў адпаведных аб'ёмах, неабходнасць павышэння кваліфікацыі, уключаючы атэстацыю і перападрыхтоўку кадраў.

**— Узровень аплаты працы работнікаў устаноў, задзейнічаных у эксперыменце, не павінен быць меншым, чым дасягнуты,** — падкрэсліваюць у ЦК прафсаюза. — Нарматыў павінен улічваць тып установы адукацыі, геаграфію яе размяшчэння, камплектнасць і г.д. праз увядзенне адпаведных карэктуючых каэфіцыентаў. Нарматыў павінен быць арыентаваны не на гранічную напаўняльнасць класа, а на метадычна і сацыяльна абумоўленую. Варта падумаць над увядзеннем нарматыву не на вучня, а на клас-камплект — гэта рэкамендуюць калегі і эксперты з Расійскай Федэрацыі, паколькі вызначальным з'яўляюцца суадносіны колькасці настаўнікаў да колькасці вучняў, а не напаўняльнасць класа.

**Трэба стварыць такі механізм фарміравання нарматыву, які быў бы арыентаваны на ўдасканаленне кваліфікацыйнага ўзроўню настаўнікаў, прыцягненне ў калектывы высокакваліфікаваных кадраў і маладых спецыялістаў.** Такім чынам, нарматыў павінен разлічвацца з улікам адпаведнага кваліфікацыйнага ўзроўню настаўнікаў. Пры гэтым надбаўкі за наяўнасць кваліфікацыйных катэгорый павінны быць перагледжаны на падставе салідарных з меркаваннем галіновага прафсаюза прапаноў Міністэрства адукацыі.

Неабходна дакладна вызначыць рамкі самастойнасці ўстаноў адукацыі, якія задзейнічаны ў эксперыменце, і паўнамоцтвы іх кіраўнікоў. Зацікаўленасць кіраўнікоў устаноў адукацыі, уцягнутых у эксперымент, павінна базіравацца на фінансавым складніку. Зыходзячы з таго, што ў Расіі эксперымент па нарматыўна-падушавым фінансаванні праводзіўся з 2006 года з улікам распрацовак і даследаванняў, якія ўжо меліся на той момант, у ЦК галіновага прафсаюза лічаць, што запланаваны ў Беларусі эксперымент павінен мець доўгатэрміновы характар — не менш як 4-5 гадоў. Толькі пры такім падыходзе можна будзе рэальна ўбачыць наступствы і ацаніць іх характар. А далейшае распаўсюджванне эксперымента на сістэму адукацыі іншых рэгіёнаў магчыма толькі пры яго станоўчых выніках.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**З інтэрвью міністра адукацыі Сяргея МАСКЕВІЧА «Звяздзе»: «Напэўна, і нам трэба думаць, як аптымізаваць сістэму фінансавага менеджменту, каб была здаровая канкурэнцыя, каб педагогі, якія таго заслугоўваюць, атрымлівалі больш высокія заробкі. Прыйшоў вучань займацца ў гурток — ёсць грошы, не прыйшоў — грошай ва ўстановы не будзе. Таксама і са школамі. Але гэтую сістэму трэба ўкараняць з вялікай асцярожнасцю, бо разважаць лягчэй, чым дзейнічаць на практыцы. Натуральна, што ў вялікім горадзе ў вучняў заўсёды было больш магчымасцяў для задавальнення ўласных адукацыйных патрэб, для выбару навучальнай установы і педагога. А як быць з укараненнем такога механізма ў сельскай мясцовасці?»**

**Старшыня ЦК галіновага прафсаюза педагогаў Аляксандр БОЙКА: «Улічваючы складанасць гэтага пытання і тую колькасць людзей, якую закране ўкараненне новай сістэмы фінансавання, трэба мець дакладнае ўяўленне, куды мы ўсе рухаемся. Трэба ведаць усе падводныя камяні, бо ў нас няма такой фінансавай «падушкі бяспекі», якая ёсць у расіян.**

# ЗАХАВАЦЬ І ПАПУЛЯРЫЗАВАЦЬ!

2012 ГОД КНІГІ

**У новага буйнога некамерцыйнага праекта «Спадчына права» нарадзіўся першынец — «Выбраныя працы» Сяргея Курылёва. Гэта кніга, пераканалі падчас прэзентацыі, будзе распаўсюджвацца сярод зацікаўленых бясплатна.**

Сяргею Васільевічу Курылёву — вядомаму вучонаму, юрысту, прафесару кафедры грамадзянскага права і працэсу БДУ — належыць мноства прац па актуальных праблемах грамадзянскага працэсуальнага права (праблемах права на іск, судовых доказаў). Большасць з іх ужо сталі бібліяграфічнай рэдкасцю. Менавіта таму людзі, неабыякавыя да выхавання маладога пакалення юрыстаў, і вырашылі аб'яднаць найбольш важныя даследаванні прававеда ў кнігу.

— Рэфармаванне заканадаўства, выкліканае пераходам да рыначнай эканомікі, пацвердзіла значэнне многіх прынцыпаў прававога рэгулявання, распрацаваных яшчэ стагоддзі таму, — адзначыў падчас прэзентацыі кнігі **старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларусі Віктар КАМЯНКОЎ.**

— Сапраўды, знаёмячыся з працамі вучоных, якіх ужо няма ўжывых, мы знаходзім ідэі, актуальныя і цяпер, — працягнуў думку **дырэктар Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Вадзім ІПАТАЎ.** — Дактрынальныя крыніцы вельмі запатрабаваныя ў заканатворчай дзейнасці. Але сістэматызаваных выданняў такога роду не існуе. А праект «Спадчына права» дазволіць сістэматызаваць працы, што істотна скароціць час на пошук патрэбных публікацый і кніг, у тым ліку для аспірантаў і дактарантаў.

Наклад «Выбранных прац» невялікі — усяго 300 экзэмпляраў. Але, як перакanaў адзін з арганізатараў праекта — **генеральны дырэктар прадпрыемства «ЮрСпектр» Алег СЛАМЯНЕЦ,** «калі мы ўбачым цікавасць да кнігі, гатовы выдаваць яе яшчэ».

Праект «Спадчына права» стартаваў восенню мінулага года. Яго асноўная мэта — захаванне і папулярызацыя навуковых прац у першую чаргу беларускіх класікаў права. Кнігі, выпушчаныя ў межах праекта, будуць распаўсюджвацца бясплатна сярод зацікаўленых арганізацый, у тым ліку і за межамі краіны. Частка з іх апынецца ў бібліятэках ВНУ, дзе вывучаецца права.

Да канца года плануецца выдаць другую кнігу. Працы якіх вучоных і практыкаў на гэты раз трапяць пад вокладку з эмблемай «Спадчына права», пакуль не вырашылі. Ініцыятары праекта — а гэта Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў, Вышэйшы Гаспадарчы Суд, Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў і прадпрыемства «ЮрСпект» — гатовы выслухаць кожную прапанову.

**Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман МАТУЛЬСКІ,** лічыць, што нядрэнна было б, каб кнігі, якія будуць выходзіць у межах праекта, увайшлі ў Нацыянальную электронную бібліятэку, якую дарučыў стварыць Прэзідэнт.

**Надзея ДРЫЛА.**


КІРМАШ штотыднёвы рэкламны выпуск № 11 (722)
аддзел рэкламы ☎ 287 17 79

**ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ**

**ПРАДАЕЦЦА**

❒ Статак авечак розных парод.
Тэл. 8 029 6748862.

❒ Козлік (3 мес.), трусы (мяса трусоў).
Тэл. 8 029 7660985.

❒ Дом у вёсцы Нясвіжскага раёна, 0,22 га, газавае ацяпленне, г/п.
Тэл. 8 017 2753829.

❒ Трактар ЮМЗ.
Тэл. 8 029 6134719.

❒ Электракацёл ВО-1 5 кВт (г. Гродна) новы, гарантыя 3 года.
Тэл. 8 017 3315666.

❒ Касілка конная сумяшчальная з трактарам.
Тэл. 8 029 7339948.

❒ Водаправодны вентыль Ø 80 мл, б/у, у добрым стане.
Тэл. 8 017 285 84 49.

❒ Участак 0,4 га, г/п, фундамент, газ, праект, 15 км ад Нясвіжа.
Тэл. 8 029 3898053.

❒ Шыкоўная шлюбная сукенка, мадэль 2012 г., памер 44—46, рост 162—170 см, колер шампань, новыя пальчаткі, грэчаскі стыль (Ампір), падушка для пярсцёнкаў. Вераніка.
Тэл. 8 029 8724810.

**КУПЛЮ**

❒ Мотаблок МТЗ.
Тэл. 8 029 4000 52

ЗВЯЗДА **КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ** звесткі не для друку: **ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя_______ №____________ Выдадзены _______________

Подпіс ________________ Дата __________


# СПЫНІЦЬ МІГРАЦЫЮ ВЁСКІ,

## або Кола дзён у Камарова

**Амаль 250 рамеснікаў сабрала 7-я рэспубліканская выстаўка-кірмаш народных рамёстваў і промыслаў «Камарова — кола дзён», што ў выхадныя прайшла на Мядзельшчыне.**

У ёй прынялі ўдзел лепшыя ганчары, кавалі, ткачы, майстры па вырабах з саломы, лазы, бяросты. Яны не толькі прадэманстравалі свае работы прысутным, але і далі майстар-класы ахвотным. Акрамя таго, абмяняліся вопытам, наладзілі асабістыя кантакты. Як заўсёды, кожны госць знайшоў для сябе занятак па душы. Хтосьці паўдзельнічаў у спартыўных і забаўляльных мерапрыемствах, конкурсах. Іншых зацікавілі экскурсіі і святочны канцэрт. А вось тыя, хто займаецца прадпрымальніцтвам, атрымалі добрую магчымасць паўдзельнічаць у «круглым стале» на тэму «Уклад малога і сярэдняга бізнэсу ў эканоміку рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь».

У Беларусі з кожным годам павялічваецца колькасць ахвотных займацца рамёствамі. Для параўнання: у 2009-м было зарэгістравана 3 395 фізічных асоб, якія ажыццяўлялі рамесніцкую дзейнасць. Сёлета такіх стала больш амаль што ўдвая.

На думку тых, каму неабыякавы лёс беларускай вёскі, спыніць міграцыю сельскага насельніцтва ў горад можна толькі ў тым выпадку, калі тут будуць прадстаўлены аналагічныя, а можа, нават і лепшыя ўмовы працы, побыту, жыцця, калі людзі будуць мець магчымасць добрага заробку. А для гэтага трэба развіваць інфраструктуру вёскі, дзе б функцыянавалі як буйныя, так і дробныя сельскагаспадарчыя, малыя прамысловыя прадпрыемствы, аб'екты сферы паслуг, агратурызму. Прычым рознай формы ўласнасці і з улікам асаблівасцяў кожнага рэгіёна. Толькі пры такіх абставінах можна прыцягнуць у вёску кадры, вырашыць праблему працоўнай занятасці сельскага насельніцтва, разбудзіць ініцыятыву і эканамічную актыўнасць. Але на развіццё прадпрымальніцтва ў сельскіх рэгіёнах можна разлічваць у тым выпадку, калі на яго падтрымку будуць скіраваны агульныя высілкі: і ўлады, і грамадскасці. У прыватнасці, была выказана думка, што нядрэнна было б, каб буйныя прамысловыя прадпрыемствы прапанавалі суб'ектам малога гаспадарання выраблядь для іх частку прадукцыі.

Удзельнікі «круглага стала» азнаёміліся таксама з вопытам работы Цэнтра развіцця сельскага прадпрымальніцтва «Камарова». Вёска Камарова — адна з нямногіх, дзе ўзорна развіваецца інфраструктура. Тут нават атрымліваюць частку цеплавой і электрычнай энергіі з альтэрнатыўных экалагічна чыстых крыніц, сем'і актыўна займаюцца агратурызмам, працуе політэхнічная школа. Цэнтр рыхтуе толькі тых спецыялістаў, якія запатрабаваны ў вёсцы, і арыентуе іх на стварэнне асабістых сельгаспрадпрыемстваў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Трагічнае святкаванне

**У Полацку сумна скончылася святкаванне з нагоды атрымання дыпломаў.**

— У адзінаццаць гадзін вечара ў службу выратавання паступіла паведамленне аб тым, што каля Храма Божага Яўлення Полацкай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы горада Полацка ў рацэ Заходняя Дзвіна тоне чалавек, — паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — Было ўстаноўлена, што ўвечары кампанія маладых людзей адзначала атрыманне дыпломаў, і без распіцця алкагольных напояў не абышлося. Адзін малады чалавек вырашыў пераплысці Заходнюю Дзвіну, але на сярэдзіне ракі яго стала зносіць цячэннем. Больш яго не бачылі. Удалося ўстанавіць, што патануў хлопец 1988 года нараджэння, які пражываў у горадзе Вілейка. Ён прыехаў на сесію ў Полацкі дзяржаўны лясны каледж.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**ЧУП «Центр исследования институтов рынка»**
**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА,**
**расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Широкая, 4 в.**

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена лота, без НДС, руб. | Задаток 10%, без НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | Трансформатор ТСМА 100/10 | 21 400 000 | 2 140 000 |
| 2 | Бытовка металлическая | 7 200 000 | 720 000 |

Организатор торгов – ликвидатор ЧУП «Центр исследования институтов рынка» ЧУП «Юриспрудент».

Продавец – ЧУП «Центр исследования институтов рынка».

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.00: г. Гомель, ул. Широкая, 4в.

Задаток перечисляется до 28.06.2012 г. (включительно), на р/с 3012511380025 в ЦКО № 3 Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, БИК 153001739, УНН 490317459.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 7 рабочих дней после подписания протокола и возместить затраты на проведение торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

Срок подачи заявления – с момента выхода настоящего объявления **до 15.00 28.06.2012 года** по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5, ком. 3.

Дата, время, место проведения открытого аукциона **30.06.2012 года в 15.00**, г. Гомель, ул. Молодости, 5, ком. 3.

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества обращаться по телефону: (8029) 698 07 48.**


# РЫБАКА ЎДАРЫЛА ТОКАМ

**35-гадовага жыхара Пастаў ударыла токам, калі ён дакрануўся вудай да праваадоў высакавольтнай лініі электраперадач.**

Незвычайнае здарэнне адбылося а трэцяй гадзіне дня на сажалцы каля вёскі Баковічы. Мужчыну з апёкамі 2-3 ступені на машыне хуткай медыцынскай дапамогі даставілі ў рэанімацыю Пастаўскай цэнтральнай раённай бальніцы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Столбцовский райагросервис» (продавец)**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ НЕФТЕБАЗЫ,**

расположенной по адресу: **Минская область, Столбцовский р-н, Новосверженский с/с, д. Новый Свержень, ул. Мирская,** в составе:

здание станции налива нефтепродуктов, инв. № 622/С-685, общая площадь – 233,4 м$^2$, в т.ч. встроенное оборудование (стояк автоналивной, оборудованный насосом – 6 шт.); здание пункта хранения мотопомпы, инв. № 622/С-688, общая площадь – 34,3 м$^2$; здание трансформаторной подстанции, инв. № 622/С-689, общая площадь – 12,3 м$^2$; здание насосной станции, инв. № 622/С-686, общая площадь – 50,1 м$^2$, в т.ч. накопительная площадка, резервуар для дизтоплива (400 м$^3$, 4 ед.)), встроенное оборудование (насосы – 4 шт.); здание насосной станции, инв. № 622/С-687, общая площадь – 38,8 м$^2$, в т.ч. встроенное оборудование (насосы – 2 шт.); здание конторы, инв. № 622/С-684, общая площадь – 54,9 м$^2$; цистерна 50 м$^3$ (23 единицы); цистерна 25 м$^3$ (7 единиц); цистерна 75 м$^3$ (5 единиц); асфальтированная площадка, площадь – 1152 м$^2$; ограждение железобетонное, площадь – 691 м$^2$; железнодорожные пути; железнодорожная эстакада; подъездные пути, площадь – 1170 м$^2$; противопожарный резервуар; очистные сооружения, кран-балка; забор на нефтебазе; кабельная линия; технологический трубопровод, протяженность 1,831 км; сети канализации, протяженность 0,508 км; сети водопровода, протяженность 0,220 км; эстакада на нефтебазе; мотопомпа.

**Начальная цена с НДС – 2 573 721 732 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **2,0549 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.**

Аукцион состоится **24.07.2012 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 20.07.2012 до 17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**



**ГВТУП «Белвнешпромсервис» организатор торгов**

**извещает о том, что 12.07.2012 г. в 12.00 по адресу: 220099, г. Минск, улица Казинца, 2 состоятся повторные открытые торги в форме аукциона по продаже:**

**Лот № 1. Погрузчик-экскаватор ТО-49,** шасси МТЗ-82.1, 2000 года выпуска, двигатель Д-243, наработка 1550 моточасов.

Начальная цена – 4 550 293 руб. (без учета НДС).

Сумма задатка для участия в торгах – 450 000 руб.

**Лот № 2. Грузовой специальный автомобиль (цистерна) ЗИЛ-130, АКПМ-3** (уборочная машина), 1989 года выпуска, МКПП, цвет – зеленый, дизель, Д-245,9 (100 кВт), пробег 5700 км.

Начальная цена – 3 013 194 руб. (без учета НДС).

Сумма задатка для участия в торгах – 300 000 руб.

Прием заявок и ознакомление с состоянием автомобиля и др. сведениями, формами заявки, соглашения, договора и др. документов производится по адресу проведения торгов с даты настоящей публикации до 11.07.2012 г. с 8.30 до 17.30 (кроме выходных и праздничных).

Тел.: в Минске (8017) 219 07 08, 212 31 25, факс (8017) 278 24 08, моб. тел. (8029) 703 89 54.

Оплата задатка производится с даты настоящей публикации до 11.07.2012 включительно **на р/с: 3012108791019 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» в г. Минске, адрес банка – г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369, УНП: 100128724, ОКПО: 03229720.**

Победитель торгов подписывает протокол о результатах торгов в день их проведения.

Победитель торгов в течение 3 банковских дней после подписания протокола о результатах торгов оплачивает затраты на организацию и проведение торгов.

Победитель торгов в течение 5 календарных дней после подписания протокола о результатах торгов заключает договор купли-продажи предмета торгов.

Победитель торгов в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену без учета НДС за минусом внесенного задатка.

В случае отказа победителя торгов оплачивать затраты на проведение торгов или подписать договор купли-продажи – задаток не возвращается.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

*УНП 100128724*


# ПЕРАД ЭКЗАМЕНАМ ТРЭБА ВЫПІЦЬ ШКЛЯНКУ ВАДЫ

**Калі прайшла толькі палова рабочага дня, а вы ўжо адчуваеце сябе як выціснуты лімон, не спяшайцеся працягваць руку па шакаладку. Больш верагодна, што вярнуць бадзёрасць вам дапаможа шклянка звычайнай вады.**

Брытанскія даследчыкі сцвярджаюць, што абязводжванне арганізма зніжае прадукцыйнасць працы, пазбаўляе энергіі і робіць чалавека вялым і апатычным. Даследчыкі з універсітэта Усходняга Лондана правялі эксперыменты з удзелам студэнтаў і заўважылі, што тыя з іх, хто піў ваду перад экзаменам, спраўляліся з заданнямі лепш за сваіх сяброў.

Хоць у рабоце прынялі ўдзел толькі студэнты, якія здавалі экзамен, навукоўцы ўпэўнены, што іх высновы адносяцца да розных людзей і сітуацый. Напрыклад, шклянка вады можа аказацца выратавальнай перад важнай гутаркай пры ўладкаванні на працу, нарадай ці публічным выступленнем. Падтрыманне нармальнага воднага балансу ў арганізме зніжае трывожнасць, якая негатыўна ўплывае на вынік. Справа ў тым, што мозг, якому не хапае вады, сігналізуе нам аб гэтым упадкам сіл і трывожнасцю.

Акрамя вады, зарадзіцца энергіяй дапамагаюць кубачак кавы, кароткі дзённы сон, а таксама любімая музыка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ПАГУЛЯЛІ ХЛОПЧЫКІ

**Тры 17-гадовыя юнакі ў гарадскім пасёлку Карма апоўначы выйшлі пагуляць. Вынікам іх шпацыру стала заведзеная крымінальная справа.**

Навучэнцы мясцовага прафесійна-тэхнічнага вучылішча спаборнічалі, хто зломіць больш агароджаў. Раніцай высветлілася, што значна пашкоджаны агароджы з жалезабетону, перавернуты кветнікі ля дзясятка дамоў на вуліцы Ільюшчанкі і Новым праспекце ў райцэнтры. Мясцовыя камунальнікі падлічваюць страты.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**


**г. ВИТЕБСК** **23.07.2012**

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА НА 50 ПРОЦЕНТОВ**

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 2. | Неиспользуемые здания сооружения, расположенные по адресу: Витебская область, г. Новополоцк, промышленная зона, и право заключения договора аренды земельных участков | Характеристика объектов недвижимости: - капитальное строение с инвентарным номером 252/С-10255 (здание специализированное для рыбоводства – здание цеха выращивания молоди) – одноэтажное кирпично-панельное здание, фундамент бетонный, перекрытия ж/б плиты, крыша рулонная совмещенная, общая площадь 933,8 кв.м, с ограждением двумя воротами и калиткой, 1991 года постройки; - капитальное строение с инвентарным номером 252/С-14871 (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства – внутриобъектные дороги и площадки рыбного хозяйства № 002067), общая площадь 3076,0 кв.м, материал покрытия – гравий, бетон; - капитальное строение с инвентарным номером 252/С-14763 (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – прудоотстойник № 0002066) – общая площадь 44745,0 кв.м; - капитальное строение с инвентарным номером 252/С-10256 (здание специализированное обрабатывающей промышленности – здание насосной воздуходувной) – одноэтажное из кирпично-панельное здание, фундамент бетонный, перекрытия ж/б, крыша рулонная, общая площадь 356,5 кв.м, 1991 года постройки; - капитальное строение с инвентарным номером 252/С-14851 (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства – подъездная автодорога на рыбное хозяйство № 002065) – общая площадь 3038 кв.м, материал покрытия – асфальтобетон, гравий. Земельные участки: с кадастровым номером 241800000009002221, площадью 0,1429 га для содержания и обслуживания подъездной автодороги на рыбное хозяйство в промышленной зоне г. Новополоцка (земельный участок для размещения объектов улично-дорожной сети общего пользования); с кадастровым номером 241800000009000118, площадью 3,5727 га для содержания и обслуживания промышленной площадки Новополоцкой ТЭЦ в промзоне г. Новополоцка (земельный участок для размещения объектов промышленности); с кадастровым номером 223800000028000112, площадью 5,0069 га для содержания и обслуживания производственной площадки. Использование для размещения объекта производственного назначения, сроком аренды 20 лет. Ограничение в использовании земель: водоохранная зона вне прибережной полосы реки Западная Двина. | 1171295447 | 234259000 |

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайт www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ: Витебское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Витебскэнерго», телефон в Витебске (0212) 475299.

**Аукцион состоится 23.07.2012 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

1. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 20.07.2012 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 23.07.2012 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

**2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.**

3. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и государственной регистрации в отношении этого земельного участка; не позднее 12 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола аукциона заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

**4. Информация об аукционе, условиях продажи, участия в торгах опубликована ранее в газете «Звязда» от 14.04.2011 № 69(26933), от 03.05.2012 № 83 (27198).**



# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Многоквартирный жилой дом по генплану № 12А, не относящийся к домам повышенной комфортности, со встроенными помещениями по проспекту газеты «Правда» в г. Минске**

**ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ**

**Застройщик** – закрытое акционерное общество «Инвест-Систем».

**Юридический (почтовый) адрес** – 220040, г. Минск, ул. Л.Беды, 8.

**Режим работы** – понедельник-четверг с 9$^{00}$ до 18$^{00}$, пятница с 9$^{00}$ до 17$^{00}$, обед с 13$^{00}$ до 13$^{50}$.

ЗАО «Инвест-Систем» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 4 сентября 2000 года за №100649060.

В течение трех предшествующих лет ЗАО «Инвест-Систем» как застройщиком построены следующие объекты:

**в 2008 году:** 9-этажный, 128-квартирный ж/д. со встроенными помещениями №80 по пр. Дзержинского;

**в 2009 году:** 9-этажный, 35-квартирный ж/д. №3а по пр. газеты «Правда»:

**в 2011 году**: 9-этажный, 120-квартирный ж/д. № 78 по пр. Дзержинского и 9-этажный, 125-квартирный жилой дом № 74 по пр. Дзержинского.

**ИНФОРМАЦИЯ О ПРОЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА**

Цель строительства – исполнение проекта по договору на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений), заключенному с Минским горисполкомом 05.07.2011г. № 301Д. Строительство жилого дома осуществляется в один этап без выделения пусковых комплексов.

По проектной документации получены заключения и согласования:

комитета архитектуры и градостроительства Минского горисполкома (№12-08/167М от 07.12.2009г,); Минского комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды (№ 02 -6/456 от 31.03.2010г.); Минского городского управления МЧС (№ 47/08 -09/655а от 23.03.2010г.); Департамента по авиации Министерства транспорта и коммуникаций (письмо №4-20-2218 от 11.05.2010); РУП «Главгосстройэкспертиза» (№2244 -5/9 от 03.05.2010г., № 517-15/11 от 20.07.2011г., № 45-15/12 от 10.02.2012г.).

Площадка строительства жилого дома расположена вдоль пр. газеты «Правда». Жилой дом представляет собой 25-этажное здание (жилых 23 этажа). В жилом доме на первом этаже размещаются три группы помещений административно-офисного назначения с обособленными входными группами, электрощитовая, мусоросборная камера и помещение уборочного инвентаря. Здание запроектировано с техподпольем и теплым техническим чердаком. Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас, несущие монолитные перекрытия. Наружные стены из блоков ячеистого бетона. Межкомнатные перегородки – из мелкоштучных материалов и блоков. Кровля – плоская с внутренним водостоком. Фундаменты свайные. Лоджии и балконы остеклены. Жилой дом оборудован двумя пассажирским лифтами и одним грузовым, мусоропроводом.

Число этажей – 25, из них 23 этажа – жилые, число секций – 1, количество квартир – 115, в том числе: однокомнатных – 23, двухкомнатных – 69, трехкомнатных – 23, Общая площадь жилых помещений – 6982,82 кв.м. Жилые помещения и помещение общественно-административного назначения без внутренней чистовой отделки.

Для заключения договоров долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, а также с юридическими лицами предлагаются десять квартир.

**Базовая цена 1 кв.м. общей площади жилого помещения при внесении первоначального взноса в размере 100% стоимости квартиры в течение десяти дней с момента заключения договора составляет:**

9 600 000 белорусских рублей за 1 кв.м. в однокомнатной, двухкомнатной и трехкомнатной квартирах;

**Базовая цена 1 кв.м. общей жилого помещения при внесении оплаты поэтапно составляет:**

9 800 000 белорусских рублей за 1 кв.м. в трехкомнатной квартире;

9 900 000 белорусских рублей за 1 кв.м. в двухкомнатной квартире и однокомнатной квартире.

Заявленные цены действительны до 31 июля 2012 года. Ежемесячно, начиная с 1 августа 2012 года, указанные цены подлежат индексации.

Разрешение на строительство объекта и земельный участок под застройку предоставлены в соответствии с решением Минского горисполкома от 14 июля 2011 г. №1963, а также актами выбора земельного участка от 12.02.2008 г., от 15.03.2009 г. и от 21.04.2009 г., утвержденными председателем Минского горисполкома соответственно 19.02.2008 г., 26.03.2009 г. и 11.05.2009 г.

Проектом предусмотрено благоустройство прилегающей территории, в том числе, устройство детских игровых площадок, оборудованной малыми формами, площадки для отдыха населения, хозяйственных площадок, гостевой автостоянки, пешеходных тротуаров, озеленение путем посадки декоративных деревьев и кустарников и устройства газона.

После утверждения в установленном порядке акта приемки в эксплуатацию жилого дома и связанных с ним иных объектов недвижимости дольщикам будут переданы указанные в настоящей проектной декларации квартиры и помещение общественно-административного назначения.

В состав общего имущества жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности после ввода в эксплуатацию жилого дома (объекта) и передачи объектов долевого строительства дольщикам, входят места общего пользования жилого дома, чердачное и технические помещения.

Срок ввода в эксплуатацию строящегося объекта в соответствии с ПСД – июль 2013 года.

Договор строительного подряда от 18 октября 2011 г. №34 -1 /26 -2011 заключен с ОАО «Строительный трест №4».

Указанное в настоящей проектной декларации предложение считать действительным по 31 июля 2012 г., либо до опубликования новой проектной декларации на данный объект.

# ШТО ТЧЭ, ЗАБЫЎШЫСЯ, РУКА?

## ЯК ЗБЕРАГЧЫ НАРОДНЫЯ ТРАДЫЦЫІ І ПРОМЫСЛЫ, АБМЕРКАВАЛІ Ў ГАНЦАВІЧАХ

**Феафанія Яўстаф'еўна Крысюк з вёскі Агарэвічы Ганцавіцкага раёна на І нацыянальнай выставе народнага мастацтва атрымала Гран-пры ў намінацыі «Лепшы традыцыйны ручнік». Было гэта чатырнаццаць гадоў таму, і майстрыхі, на жаль, ужо няма сярод нас. Але справа таленавітай паслядоўніцы сваіх бабуль ды аднавяскоўак працягваецца. Народны майстар Рэспублікі Беларусь Ніна Мікалаеўна Казак, якая працуе ў раённым Доме рамёстваў, перадае навыкі малодшаму пакаленню. А крыніцай творчага натхнення, паводле яе слоў, служыць безліч народных арнаментаў, якія захаваліся ў вёсцы Хатынічы, апісанай Якубам Коласам у трылогіі «На ростанях». Цяжка паверыць, але ў Хатынічах да гэтай пары амаль у кожнай хаце зберагаюць у куфрах і шафах мноства ручнікоў і намітак, сувояў палатна.**

### Мост з даўніны ў сучаснасць

У кожнай вёсцы ёсць свае майстры і свае традыцыі. Менавіта таму і выбралі Ганцавічы месцам правядзення Міжнароднага семінара па захаванні традыцый і развіцці новых відаў народных рамёстваў. Як сказаў у сваім вітальным слове старшыня Ганцавіцкага райвыканкама Аляксандр Саланевіч, нават убачыць гэтую прыгажосць, якую робяць тутэйшыя майстры, — гэта нібы прайсці па мосце, які аб'ядноўвае даўніну з сучаснасцю. У вёсках Ганцаўшчыны можна знайсці нават адгалоскі некаторых 1000-гадовых язычніцкіх традыцый. Тут да гэтай пары адорваюць ручнікамі дарагіх гасцей. Кожная сям'я мае народныя строі, захавалася і мясцовая гаворка, і рэцэпты старадаўніх страў.

— Наша прырода не лічыцца экзатычнай, — кажа кіраўнік раёна. — Але яе ненавязлівая прыгажосць, прастата і веліч абавязкова адкрыюцца таму, хто ўмее цаніць сапраўднае.

Сапраўднае тут было ўсё. Цэлая плошча ручнікоў, вышыванак, посцілак. «Сорак саракоў ручнікоў» — так назвалі арганізатары выставу вясельнага пасагу. І ручнікі сталі дастойным аздабленнем галоўнага атрыбута свята — каравая. Караваі прывезлі з кожнага раёна. У большасці выпадкаў прэзентавалі іх самі аўтары, тыя, хто выпякаў. Як, напрыклад, Пётр Сцяпанавіч і Настасся Ігнатаўна Шапецюкі з вёскі Лелікава Кобрынскага раёна. Гаспадыня расказала, што пякла каравай яшчэ па рэцэпце сваёй бабулі. А гаспадар, паводле традыцыі сваёй мясцовасці, майстраваў вясельную дугу. Маладых у Лелікаве і навакольных вёсках абавязкова адорвалі дугой, каб злучыць іх, як злучае дуга дзве аглоблі ў возе. Пры гэтым новаспечаным сужэнцам жадалі разам дружна цягнуць сямейны воз, тым самым нагадваючы, якая нялёгкая гэта работа. Яшчэ Пётр Шапяцюк паказаў адмысловую пляшку, убраную вяночкам кветак. Гарэлку «ў вяночку» ставілі каля маладых, а вось адкаркаваць яе дазвалялася толькі пасля нараджэння першынца. Да таго часу пляшку павінна была захоўваць маладая гаспадыня. Вось вам і клопат пра здаровых нашчадкаў, які закладзены ў традыцыі палешукоў з глыбіні вякоў. Настассю Шапяцюк асабліва актыўна фатаграфавалі ўдзельнікі семінара за яе дзіўны галаўны ўбор. Аказалася, яшчэ адна традыцыя мясцовасці: каравайніца павінна была надзяваць упрыгажэнне з пер'яў. Часцей выкарыстоўвалі пёры жураўля. Але падыходзіла і яркае апярэнне петушынага хваста.



### Караваю мой раю

Прыгожы, пухкі, духмяны каравай прывезла на свята 77-гадовая Сцепаніда Аляксееўна Сцепанюк з Дарапеевічаў Маларыцкага раёна. Ёй дапамагала цёзка па прозвішчы, аднасяльчанка Ніна Фёдараўна. Разам яны заспявалі для гасцей вясельную песню. Усе звярнулі ўвагу на фартух Ніны Фёдараўны з вышытым на ім тэкстам. Гаспадыня сказала, што рэч дасталася ёй ад прабабулі, фартушку больш за сто гадоў. А вышыты на ім пажаданні любові і згоды.

Як заўсёды, багатай была мотальская экспазіцыя. Ручнікі і падушкі размяшчаліся ў куфрах. Што асабліва цікава — у Моталі, акрамя каравая, на вяселле пяклі і хлеб. Кожны бохан меў сваю назву. Боханы-сваты выпякаліся для свата, з бацькоўскімі боханамі пачыналі вяселле, бласлаўлялі маладых. Каравайны боханчык упрыгожваў каравай. А яшчэ былі маленькія боханы-падручнікі, яны выконвалі функцыю абярэгаў. Іх маладыя пэўны час павінны былі трымаць пад пахаю, каб выпадкова не разняць рукі, каб паміж новымі мужам і жонкаю ніхто не прайшоў — не напрарочыў разлукі.



Мотальскі вясельны хлеб.

Фальклорна-этнаграфічны калектыў «Мотальскія суседкі» і пазней, на сцэне, удзельнічаў у цікавай дзеі — выпяканні каравая. З гэтай імправізацыі можна было даведацца, колькі асаблівасцяў у рытуале прыгатавання вясельнага атрыбута. Напрыклад, садзіць каравай у печ павінна была не толькі жанчына замужняя (а не ўдава), але і сабой прыгожая, спрытная, працавітая.

Некаторыя ўдзельнікі выставы ладзілі імправізаваныя прэзентацыі літаральна на плошчы. А намеснікаў міністраў культуры і спорту і начальніка ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама дзяўчаты прыцягнулі да прагляду пасагу. Там жа завязвалі вузлы на ручніках: колькі вузлоў атрымаецца — столькі дзяцей будзе ў сям'і.

### Адкуль мы пайшлі і што пакінем нашчадкам?

Гэта галоўнае пытанне, якое найчасцей гучала на семінары, да адказу на якое спрабавалі наблізіцца яго ўдзельнікі. Гаварылі аб набытках. **Намеснік міністра культуры Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ** падкрэсліў, што за апошнія 25 гадоў створана сістэма падтрымкі народных промыслаў. **Намеснік міністра спорту і турызму Часлаў ШУЛЬГА** казаў аб традыцыйнай народнай культуры як прынада для турыстаў, а промыслы назваў спосабам заробку для мясцовых жыхароў. А вось **доктар мастацтвазнаўства Яўген САХУТА** паспрабаваў данесці да ўдзельнікаў сваю заклапочанасць. Катастрафічнае старэнне і заняпад вёскі звужаюць умовы для заняткаў рамёствамі. Стварэнне аграгарадкоў вырашае сацыяльныя праблемы, а праблему адраджэння рамёстваў не вырашае. Бо нават у дамах і цэнтрах рамёстваў народную творчасць часта падмяняюць безгустоўнасць і масавая культура. Здараецца, у гуртках альбо суполках па вышыўцы замест народных арнаментаў бяруць «у работу» ўзоры з глянцавых часопісаў. І крыжыкам вышываюцца галандскія пейзажы, а таксама коцікі, конікі. Атрымліваецца нават не асучасніванне, а падмена культуры псеўдакультурай. Старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз майстроў народнай творчасці» расказаў і пра цяжкасці з прысваеннем звання «Народны майстар». Народных майстроў у нашай краіне 65. Гэта смехатворна мала, калі народнай творчасцю і промысламі займаюцца больш за 30 тысяч чалавек. Але, акрамя гонару, такое званне нічога не дае. Старэйшыя людзі з глыбінкі і не імкнуцца займець статус народнага, а моладзь, якую вылучаюць, часта і блізка «не цягне» на званне. Што за народны майстар, калі на мове народа ён і двух слоў звязаць не можа, ды і наогул прыехаў колькі гадоў таму з блізкага замежжа? Сустракаліся, паводле слоў Яўгена Сахуты, і такія прэтэндэнты.

### Гараднянская мамзэлька, іванаўская бочачка

Таму вельмі важна падтрымаць сапраўдных майстроў, асабліва тых, якія маюць маладых паслядоўнікаў. **Загадчык аддзела традыцыйнай культуры Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра Ларыса БЫЦКО** з-за трыбуны семінара паказала прысутным «мамзэльку» — гараднянскі гаршчок. Не адну сотню гадоў тут робяць посуд, якім некалі адмыралі кілаграм збожжа. Відаць, яго памерамі і прывабнасцю абумоўлена назва. У Гарадной Столінскага раёна ганчарства засталося ў аўтэнтычным выглядзе. Цяпер там перыядычна праходзяць святы, выставы, міжнародныя пленэры ганчароў. Але ў вёсцы засталося толькі сем патомных майстроў. І патрэбна тэрміновая дакументальная фіксацыя, так бы мовіць, натуры, якая знікае. Варта выдаць нармальныя фотаальбомы, кнігі, даследаванні, — даводзіла Ларыса Мікалаеўна.



Фартух з Дарапеевічаў.

Добра, што ганчары ў Гарадной перадаюць свае навыкі маладым хлопцам. Як і іванаўскія бондары, якія падхапілі майстэрства ад дзядоў і стварылі школу бондарства. Яна ўжо атрымала пэўную вядомасць, адзначана спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта. Пра школу бондарства расказвалі многа цікавага. Займацца туды прыходзяць нават так званыя «цяжкія» падлеткі. На занятках яны атрымліваюць навыкі, якія потым становяцца шляхам да прафесіі. Школа зарабляе сякія-такія грошы. Адзін з яе былых выхаванцаў вярнуўся сюды майстрам-настаўнікам.

Такіх бы школ — ды пабольш! — пагадзіліся многія выступоўцы. Пра тое, што немінуча страчваем, з болем казаў і Іван КРУК, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Іван Іванавіч гаварыў аб тым, што сыдзе пакаленне 70-80-гадовых, а з імі апошнія жывыя парасткі народнай культуры. А для захавання яе, для папулярызацыі мы пакуль што робім недаравальна мала. «Чые, скажыце, дзеці пры ўступленні ў шлюб стаялі на такім вось ручніку?» — накіраваў у залу, здавалася б, рытарычнае пытанне Іван Іванавіч. Але... узнялося каля дзясятка рук. Дырэктар абласной бібліятэкі Тамара Данілюк падняла дзве рукі — абедзве яе дачкі ішлі замуж з традыцыйнымі беларускімі ручнікамі. І гэта ўсяліла пэўны аптымізм.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

*Ганцавіцкі раён.*

# ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ ЗАДАЧЫ Ў НАС АГУЛЬНЫЯ

**— Мы стаім на парозе нараджэння еўразійскага вяшчальнага саюза, які можа быць створаны па аналогіі з еўрапейскім вяшчальным саюзам, — такую ідэю агучыў у Гомелі Генадзь Давыдзька, які ўзначальвае Камісію па інфармацыйнай палітыцы і ўзаемадзеянні з грамадскімі аб'яднаннямі саюзнага парламента.**

— Такі еўразійскі вяшчальны саюз дапаможа нам зрабіць празрыстым агульнае інфармацыйнае поле, — падкрэсліў Генадзь Давыдзька. — СМІ, інфармацыйная палітыка ўвогуле — магчыма, самы галоўны складнік саюзніцкай работы. На гэтай «тэрыторыі» час ад часу ўзнікаюць нейкія непаразуменні. У Саюзнай дзяржаве працуе шмат агульных праектаў: па барацьбе з наркотыкамі, ахове здароўя, экалогіі... Але, калі не будзе належнага інфармацыйнага асвятлення гэтых падзей, тады і работа не будзе мець сэнсу.

Дарэчы, дэпутаты Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі падтрымалі ініцыятыву Тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі Саюзнай дзяржавы стварыць фільм, прысвечаны падзеям Першай сусветнай вайны. На пасяджэнні таксама абмяркоўваліся магчымасці пашырэння інфармацыйнага поля Саюзнай дзяржавы, змены фармату часопіса «Союзное государство», пытанні бюджэтнай сферы. Саюзныя парламентарыі сустрэліся з кіраўніцтвам Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта, наведалі тэлерадыёкампанію «Гомель» і Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі. Акрамя таго, дэпутаты Парламенцкага сходу падвялі вынікі работы секцыі «Бяспека агульнай інфармацыйнай прасторы Саюзнай дзяржавы» ў рамках навукова-практычнай канферэнцыі «Актуальныя праблемы будаўніцтва і развіцця Саюзнай дзяржавы», якая адбылася ў канцы мая ў Санкт-Пецярбургу.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

■ Надвор'е

## БУДЗЕ ЦЁПЛА І ДАЖДЖЛІВА

**Цёпла і дажджліва будзе ў Беларусі на гэтым тыдні, паведаміла ўчора галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла Парашчук, перадае БЕЛТА.**

Цяпер па рэспубліцы пераважае малавоблачнае і сонечнае надвор'е, але такі пачатак тыдня вельмі падманлівы. Атмасферныя працэсы на гэтым тыдні будуць характарызавацца нестабільнасцю. «Парасоны застануцца запатрабаванымі практычна кожны дзень, а тэмпературны рэжым чакаецца вельмі няўстойлівым», — падкрэсліла галоўны сіноптык.

Сёння пад уплывам цёплага міжземнаморскага паветра і актыўных франтальных падзелаў чакаюцца неспрыяльныя ўмовы надвор'я. У дзённы час месцамі пры навальніцах шквалістае ўзмацненне ветру, град і моцныя ліўні. Тэмпература паветра днём чакаецца 24-29, па поўдні — 30-32 градусы вышэй за нуль.

Надвор'е ў сераду ненадоўга палепшыцца, спыняцца дажджы, сціхне вецер. У начны і ранішні час у нізкіх мясцінах і паблізу вадаёмаў могуць згушчацца непрацяглыя туманы. Тэмпература паветра ноччу складзе 9-16 градусаў, па паўднёвым усходзе да 19 градусаў цяпла. Днём чакаецца 21-28 градусаў, па поўдні паветра прагрэецца да 30 градусаў.

У чацвер і пятніцу Беларусь апынецца на шляху цыклапічнага віхру, які будзе павольна перамяшчацца з паўднёвага захаду Еўропы на поўнач еўрапейскай часткі Расіі. На большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі, у асобных раёнах чакаюцца моцныя ліўні. Днём прагназуецца ад 16 да 18 градусаў па паўночным захадзе і да 30-32 градусаў па паўднёвым усходзе краіны ■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## «НАРОДНАЕ» ІРО МІНСКАГА ЗАВОДА ПЕНІСТЫХ ВІН ЗАВЕРШАНА: ПРАДАДЗЕНА 68,63% АКЦЫЙ

У мінулую пятніцу быў апошні дзень, калі можна было набыць акцыі ААТ «Мінскі завод пеністых він». Як паведамілі ў ТАА «Агенцтва дзелавых сувязяў», усяго з 2 мая па 15 чэрвеня 2012 года пад час «народнага» ІРО было рэалізавана 68,63% акцый ад усяго выпуску: заключана 863 здзелкі, прададзена 164704 акцыі на агульную суму 28,238 мільярда беларускіх рублёў. На працягу гэтага тыдня вынікі публічнага размяшчэння акцый будуць зацверджаны, і адпаведныя змены будуць унесены ў статут акцыянернага таварыства. Каштоўныя паперы зарэгіструюць у рэестры, ім будуць прысвоены пастаянныя нумары — пасля гэтага кожны, хто набыў сабе акцыі Мінскага завода пеністых він, атрымае законнае права ўласнасці на іх.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## НАВАТ ДРЭВЫ НЕ ВЫТРЫМАЛІ...

Вецер, які прайшоўся па тэрыторыі Гомельшчыны, моцна пашкодзіў цагляны кароўнік у вёсцы Шарэйкі КСУП «Прудокскае» ў Калінкавіцкім раёне. Стыхія значна пакалашмаціла і дах сенасклада. Нарабіў бяды вецер і ў абласным цэнтры. Дзясяткі магутных і прыгожых дрэў па вуліцы Перамогі і ў Піянерскім скверы Гомеля зваліліся пад націскам стыхіі. Людзі пры гэтым не пацярпелі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ДРЭВА РАЗБУРЫЛА ДАХ

У гарадскім пасёлку Лёзна на вуліцы Гагарына ў выніку моцнага ветру дрэва ўпала на жылы дом і цалкам разбурыла дах.

— Хуткасць парываў ветру ў райцэнтры дасягала 15-18 метраў за секунду. У выніку падзення дрэва дах дома быў пашкоджаны на ўсёй плошчы. Пацярпелых няма. Дом належыць жанчыне, фельчару ўстановы аховы здароўя «Лёзненская Цэнтральная раённая бальніца». Супрацоўнікі МНС распілавалі дрэва і сцягнулі яго з даху дома. Пытанне па аднаўленні даху будзе вынесена на пасяджэнне раённай камісіі па надзвычайных сітуацыях.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Небяспека

## РАЗБІРАЎ ДОМ І ЗАГІНУЎ

**У Верхнядзвінску на вуліцы Маскоўскай падчас разбору дома загінуў чалавек.**

— Гэты дом быў прызнаны непрыдатным для далейшага пражывання, жыхароў расялілі па іншых адрасах пасля пажару ў снежні пазамінулага года, — паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — Высветлілася, што ў гэтым драўляным, абкладзеным цэглай сямікватэрным аднапавярховым доме, пабудаваным напрыканцы 1950-х гадоў, у пакоі абвалілася драўлянае перакрыцце. Пад заваламі аказаўся грамадзянін 1963 года нараджэння, непрацуючы, без пэўнага месца жыхарства. Як высветлілася, мужчына самавольна праводзіў дэмантаж будаўнічых канструкцый для ўласных патрэб.

Каля дзвюх гадзін дня выратавальнікі з дапамогай механізаванага аварыйна-выратавальнага абсталявання выцягнулі з-пад будаўнічых канструкцый цела загінулага.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ** ■

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

**Віктар Варанец некалькі гадоў запар удзельнічае ў конкурсе апавяданняў «Звязды», і яго імя ўжо было ў ліку пераможцаў. Свядома ці не, але аўтар кожны раз спрабуе сябе ў іншым жанры: у яго творчым багажы ёсць гумарэскі, фантастычныя, дэтэктыўныя апавяданні. Сёння ж мы прапануем твор Віктара Варанца, які пераносіць чытача ў далёкую беларускую мінуўшчыну.**

**Алесь БАДАК**

# КАРОНА ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ВІТАЎТА

## (ГІСТАРЫЧНАЕ АПАВЯДАННЕ)

**Віктар ВАРАНЕЦ**

Вечар быў марозны і надзвычай цёмны. Неба зацягнула хмарамі, якія хуценька праглынулі і месяц, і зоркі. Павольна закружылі ў паветры бялюткія сняжынкі. Як раптам падзьмуў паўночны вецер, узняў аж да неба снежныя сумёты — і пачалася сапраўдная бура. Кастусь, з галавы да ног аблеплены снегам, ускочыў у сенцы і адразу ж адчуў усю ўтульнасць цёплай вясковай хаты. Стары Панас, тупаючы ля печы, з усмешкай зірнуў на хлопца.

— Што, люта на двары? Гэта табе не ў горадзе. У нас дык усё па-сапраўднаму. Хлеў зачыніў?

— Зачыніў, дзядуля! — адказаў Кастусь.

— Ну тады распранайся. Вячэраць будзем.

Кастусь, студэнт медыцынскага ўніверсітэта, любіў на канікулы прыязджаць да дзеда на хутар. Тут было цікава ўсё: і адарванасць ад цывілізацыі (хата стаяла ў лесе, за шэсць кіламетраў ад бліжэйшай вёскі, і да гэтага часу тут не было нават электрычнасці), і прырода, і сапраўдная натуральнасць жыцця. Пасля смерці жонкі старшыня калгаса не раз прапаноўваў Панасу пераехаць у аграгарадок: маўляў, там і жыццё лягчэй, ды і хутар гэты не тырчаў бы цвіком у лесе. Але стары не хацеў кідаць наседжанае месца, а прымушаць да пераезду старшыня не адважваўся: усе ведалі круты нораў Панаса, які на гэтай зямлі і партызаніў у вайну, і першым старшынёй мясцовага калгаса быў. І да дзяцей у горад стары перязджаць не хацеў.

— Што мне там рабіць? Як на могілках — адна цэгла ды бетон...

Але сам вельмі любіў, калі да яго прыязджалі ўнукі, асабліва Кастусь, у якім Панас бачыў сябе ў маладосці.

Павячэраўшы і прыбраўшы са стала, Панас узяў газоўку і з унукам перайшоў у другі пакой. На вуліцы скуголіла завіруха, прыемна гуло ў коміне, крыху дрыжаў агеньчык у газоўцы. І ад усяго гэтага на душы было так добра, што і не перадаць словамі.

Дзед прылёг на ложак. Кастусь прысеў каля яго на ўслон і, як звычайна, папрасіў:

— Раскажы што-небудзь з мінуўшчыны.

— З мінуўшчыны? — перапытаў стары. — Дык я табе, здаецца, ужо ўсё пераказаў.

— Не можа быць, — запярэчыў унук. — Нават калі штовечар пра адзін год твайго жыцця расказваць, і то колькі дзён спатрэбіцца...

На хвіліну Панас задумаўся, як раптам схамянуўся.

— Слухай, я ж ледзьве не забыўся. Увосень лазіў на гару, перабіраў ламачча, што назбіралася за гады. І ведаеш, знайшоў там куфэрачак. Адкуль узяўся — бог адзін ведае. А там розныя старыя паперкі з запісамі. Мае вочы не разабралі, што там і да чаго, але, думаю, Кастусь прыедзе — прачытаем.

Панас выйшаў за дзверы і ўжо праз хвіліну вярнуўся з невялікім, акаваным жалезам куфэрачкам. Перадаў унуку. Кастусь асцярожна падняў вечка і сапраўды ўбачыў нейкія спісаныя лісты жоўтай і вельмі тоўстай паперы. І мова, якой карыстаўся незнаёмы аўтар, была як быццам беларускай, але, разам з тым, і нейкай незвычайнай. Але больш за ўсё ўразіў надпіс на адным з іх: «Карона вялікага князя Вітаўта».

Кастусь падцягнуўся бліжэй да газоўкі і пачаў чытаць уголас.

«І даў Бог нарэшце вялікую ласку да зямлі нашай. Ад мора і да мора зрабіўся мір і спакой у княстве Літоўскім. І выйшлі на палі аратыя, і адплылі ў доўгія дарогі купцы заможныя, і зазеленелі ў гарадах і вёсках сады ды палеткі. Прыціхлі ворагі ў схронах сваіх, баючыся і носа высунуць. І славілі ўсе вялікага князя Вітаўта.

І паклікаў неяк мяне, свайго лепшага даезчыка, да сябе княжа наш Вітаўт. І сказаў мне наступнае:

— Слухай мяне ўважліва, войтка! Прыехалі да нас папскі нунцыі з шаноўнаю прапановаю. Папа Рымскі Іаан XXIII са сваёй ласкі хоча мяне каранаваць, каб і дзяржава наша стала каралеўствам. Ты ж ведаеш, Войтку, што лацінянам асаблівай веры даваць не варта. Але я ведаю і іншае. Сёння мы Папе вельмі патрэбныя, бо Папа ўжо прагна глядзіць на Усход. Францысканцы штодня з раніцы тоўпяцца ля маіх дзвярэй... Іаан XXIII, канешне, вядомы п'яніца і распуснік, але ён Папа. І ён таксама патрэбны нам.

— Даруйце, Ваша княская мосць, — дазволіў я сабе запытацца, — але нашто нам, праваслаўным ліцвінам, той Папа? А выпіць мы і самі не дурні.

— Не, не быць табе, лайдаку, ніколі панам! Якая розніца, колькімі пальцамі ты хрысцішся? Бог адзіны. І каталіцкая Еўропа каталіцкую Літву хутчэй да сябе прыме. Бо галоўны наш вораг сёння на Усходзе. А калі княства стане яшчэ і каралеўствам, дык і каралі астатнія да нас лагодней ставіцца пачнуць. Зараз зразумела табе, дурнота гарадзенская?

— Так, ясны пане, — пакорліва адказаў я.

— Добра. Але тлумачыў усё гэта я не для забавы тваёй, як разумееш. Ехаць мне, вялікаму князю, па карону не з рукі. Як збых апошні з рукой працягнутай. Не, мы — вялікая дзяржава і гонар свой маем. Папу таксама сюды не даклічашся. Баіцца ён лясоў неабсяжных нашых. Таму па карону паедзеш ты. Папу я ўжо абвясціў, недзе над каронай імшу спраўляе. Даю табе, Войтка, на ўсю дарогу два месяцы. І глядзі, блазан, не дай мне прычыны шкадаваць аб тым, што даверыў табе лёс панства нашага...

Нельга перадаць тое пачуццё гонару, што напоўніла сэрца маё ад такога даручэння. І ўжо ранiцай я з васьмю лепшымі княжацкімі ваярамі выехаў у Рым.

Бог спрыяў нашай пачэснай місіі. Праз дваццаць шэсць дзён мы былі ў Вечным горадзе. У папскіх пакоях нам уручылі каралеўскую карону, дзяржаўную грамату да яе, і мы, не губляючы часу, паехалі назад. На васямнаццаты дзень мы дасягнулі Браніцкага лесу. За ім пачыналіся землі Польшчы, а далей — родныя абшары. Але гэты лес мне заўсёды не падабаўся. Яшчэ як пад Дуброўнаю разбілі мы крыжакоў, тыя нямногія, што ацалелі, пачалі рабаваць у Браніцкім лесе. Я папярэдзіў хлопцаў, каб сцерагліся, і мы паволі рушылі наперад. Калі сонца пачало хавацца за вершалінамі векавых дубоў, я пачуў выразнае гуканне бугая. Яму тут жа адказаў другі, трэці. Не, панове, вы можаце ашукаць любога, але толькі не мяне, княжацкага даездчыка. Сапраўдны крык бугая нагадвае лёгкі клёкат, а вы верашчыце, як дурны на могілках. Мы выцягнулі мячы, дасталі з-за спіны самастрэлы.

Страла прасвісцела ля самай маёй галавы, абдрапаўшы правую шчаку. Я тут жа стрэліў у густое лісце разлапістага дуба. Пачуўся прыглушаны крык, але глянуць туды ўжо не было калі. З гушчару на нас кінулася чалавек з дванаццаць узброеных людзей. Чацвёра з іх былі на конях. Добрая амуніцыя, доўгія крыжацкія мячы, упэўненая пастава выдавалі ў іх сапраўдных ваяроў. Менавіта яны вялі за сабой кнехтаў.

— Гнат і Лаўрын са мной на вершнікаў, — загадаў я. — Астатнія займіцеся пешымі!

Выхапіўшы секіру, любімую маю зброю, я кінуўся на крайняга злева кнехта. Ён тут жа зрэагаваў і, выставіўшы наперад магутны меч, паімчаўся на мяне. Наблізіўшыся да яго, я рэзка адхіліўся ўправа, імгненна адчуў, як бязлітасныя зазубрыны мяча прабаранавалі па маім плячы, і рубануў варожага каня па сцягне. Пачулася хрусценне косці. Конь аж узвіўся ад болю і тут жа заваліўся на бок, падмяўшы пад сябе гаспадара. Толькі галава ў шлеме тырчала з-пад тулава каня. Але тырчала толькі хвіліну. Узмах секіры — і яна пакацілася, як вожык, па траве. Я азірнуўся. На Лаўрына насядалі адразу два кнехты. Небарака ледзьве паспяваў адбіваць удары. Я размахнуўся і кінуў секіру аднаму з ворагаў у плечы. Ледзь не напалову ўвайшла секіра ў спіну. Рыцар адразу ж упаў тварам на зямлю. Другі ваяр усяго на імгненне зірнуў на свайго паплечніка, але і гэтага хапіла Лаўрыну, каб паласнуць ворага мячом уздоўж тулава. Тым часам Гнат ужо разабраўся са сваім кнехтам. Рэшткі яшчэ недабітай хеўры, убачыўшы, які лёс напаткаў іх камандзіраў, кінуліся ў лясны гушчар наўцёкі.

Усе нашы хлопцы, дзякуй Богу, былі жывыя. Ну а раны? Што тыя раны? Памазалі гаючай маззю, перавязалі і рушылі далей. Паколькі Лаўрын у баі страціў свайго каня, давялося скарыстаць кнехтавага.

Гадзіны праз чатыры лес скончыўся, і наперадзе мы ўбачылі невялічкае мястэчка. Гэта быў польскі Згажэлец. Адсюль да роднай Літвы і рукой падаць. Параіўшыся, вырашылі заначаваць у мястэчку, каб з раніцы прадоўжыць наш шлях.

Згажэльская карчма была вялікай, немалы пакой раздзелены сценкай на дзве паловы: адна для шляхцічаў, а другая для простага люду. Мы, зразумела, размясціліся ў лепшым з пакояў. Гаспадар карчмы хуценька выставіў на доўгі драўляны стол міскі з кнедлікамі, яешню, абкладзеную свінымі каўбасамі, вэнджаныя лапы мядзведзя, жбаны з сычаным півам і духмяным віном... Пах быў такі неверагодна прыемны, што мы адразу ж накінуліся на гэтае смакоцце. Першы кубак узнялі за пана Бога, што засцярог нас ад смерці ў Браніцкім лесе. А другі кубак выпілі за гаспадара нашага вялікага князя Вітаўта, абаронцу зямлі Літоўскай. Тым часам падышлі музыкі, з песнямі завіталі да нас выляжанкі. Закіпела сапраўднае вяселле. І закруцілася ўсё ў галаве карагодам: тосты, смех, дзявочыя твары...

Апрытомнеў я, калі сонца стаяла ўжо досыць высока. На падлозе храплі ўсе мае хлопцы. Зброя, адзенне валяліся па пакоі.

«Карона», — ляснула ў маю хворую галаву. Але нідзе ў пакоі я не ўбачыў драўлянай скрыні. Я хуценька расштурхаў хлопцаў. Ужо праз хвіліну яны стаялі апранутыя і засяроджаныя. Мы кінуліся да карчмара. Убачыўшы нас, ён ліслява заўсміхаўся.

— Як маюцца вяльможныя паны? Ці спадабалася вам у старога Зямы?

Я адразу ж схапіў яго за каўнер.

— Дзе драўляная скрыня, што была ўчора пры мне?

— Скрыня? — перапытаў перапалоханы Зяма. — Я так разумею, што пан гаворыць пра тую скрыню, у якой вазіў залатую карону?

Тут прыйшла мая чарга здзіўляцца.

— А адкуль ты ведаеш пра карону, стары хлуст?

— А як жа не ведаць беднаму Зяме, калі шчодры пан учора сам паказваў яе ўсім.

— Ну і што далей? Далей што было?

— А далей вяльможны рыцар разрубіў яе і кожнай дзяўчыне падарыў па кавалку, каб зрабілі пярсцёнкі на памяць. Пан і старому Зяме падарыў кавалачак.

І карчмар дастаў аднекуль анучку, разгарнуў яе — і я з жахам убачыў кавалак былой каралеўскай кароны.

Я не хацеў болей жыць. Так бы і сталася, але хлопцы надзейна звязалі мяне, уладкавалі на кані, і мы панура рушылі дадому.

Я расказаў князю ўсю праўду, скленчана просячы пакараць мяне смерцю. Але міласць Вітаўта не ведае межаў. Ён адаслаў мяне ў Горадню, а ўсім паведаміў, што карону ў Польшчы адбілі ў нас кнехты. А неўзабаве і сам памёр. Не ведаю, можа, гэта і мы наблізілі яго смерць. Але да смерці буду клясці сябе, што вялікі князь Вітаўт так і не стаў каралём, а наша Вялікая Літва — каралеўствам. І нешта падказвае мне, што яшчэ не раз адгукнецца майму народу тая гулянка ў заклятым Згажэльцы.

Уважаемые акционеры

## ОАО «Пищевой комбинат «Веселово»

**28 июня 2012 г. в 15.00**

**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Пищевой комбинат «Веселово» по адресу: Минская область, Борисовский район, д. Веселово, ул. Заводская, 24 (актовый зал).**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Пищевой комбинат «Веселово».
2. Об утверждении решения о выпуске акций дополнительной эмиссии.
3. О внесении изменений в Устав ОАО «Пищевой комбинат «Веселово».

Список участников собрания будет сформирован по состоянию реестра на 22 июня 2012 г. Регистрация участников собрания будет проводиться с 14.00 до 14.45 по месту проведения собрания.

Для регистрации участникам собрания при себе необходимо иметь паспорт (для представителя акционера – паспорт и доверенность).

**СПРАВКИ ПО ТЕЛЕФОНУ (80177) 777741.**

**УВЕДОМЛЕНИЕ**

**Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига» СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 19 июля 2012 года в 13.00 со следующей повесткой дня:**

**1. О заключении сделки, в совершении которой имеется заинтересованность аффилированного лица Общества.**

Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 50, торговый центр «Рига».

Регистрация участников собрания будет проводиться в день собрания с 12.30 до 13.00.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность; представителю акционера — доверенность и документ, удостоверяющий личность.

*Наблюдательный совет ОАО «Универсам Рига».*

Утерянные филиалом Белгосстраха по г. Минску бланки страховых полисов по обязательному медицинскому страхованию иностранных граждан и лиц без гражданства, временно пребывающих или временно проживающих в Республике Беларусь серии БВ с № 2249127 по № 2249130, серии БВ с № 2305867 по № 2305870, серии БВ с № 2305969 по № 2305970 **считать недействительными.**

УНП 101883943

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский радиозавод» (продавец)

### извещает о проведении 20 июля 2012 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

| № лота | Наименование | Адрес объектов | Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб. | Начальная цена продажи имущества одним лотом | Задаток, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | станок вертикально-сверлильный мод. 2Н125 (инв. № 1550) | г. Гомель, ул. Объездная, 9 | 8 298 000 | **85 294 000** | **8 500 000** |
| | станок вертикально-сверлильный мод. 2Н125 (инв. № 1519) | | 8 298 000 | | |
| | станок вертикально-сверлильный мод. 2Н125 (инв. № 1535) | | 8 298 000 | | |
| | станок вертикально-сверлильный мод. 2Н125Л (инв. № 1550) | | 7 325 000 | | |
| | станок вертикально-сверлильный мод. 2Н125 (инв. № 5555578) | | 10 999 000 | | |
| | полуавтомат резьбонарезной мод. 2056 (инв. № 1406) | | 21 038 000 | | |
| | полуавтомат резьбонарезной мод. 2056 (инв. № 1408) | | 21 038 000 | | |

**ИМУЩЕСТВО РЕАЛИЗУТСЯ ОДНИМ ЛОТОМ!**

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Гомельский радиозавод», ул. Объездная, 9, 246027, г. Гомель.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «Гомельский радиозавод») р/с 3012111887011 в Региональной Дирекции № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», МФО 151501369, УНП 400069535 **по 18 июля 2012 года** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель **по 18 июля 2012 года** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (имущество продаются одним лотом) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Положением ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

